Віншуем з 25 Сакавіка!

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

ЯЎГЕН ЯНЧУК ☞ 4

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 13 (2602) Год LI | Беласток, 26 сакавіка 2006 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Маніфестацыя на мяжы ў Кузніцы-Беластоцкай

Салідарныя з Беларуссю

Раіна Стэфанчук

Перад прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі ўсю Польшчу захапіла хваля салідарнасці ў змаганні за свабоду, дэмакратыю і захоўванне правоў чалавека ў краіне кіраванай рэжымам Аляксандра Лукашэнкі. У Польшчы: Гданьск, Кракаў, Торунь, Познань, Вроцлаў, Варшава, Беласток сваю салідарнасць і пратэст галоўным чынам выспеўвалі. Дні салідарнасці з Беларуссю поўным ходам пачаліся канцэртам у нядзелю — у Варшаве на Новым рынку, дакладна тыдзень да даты прэзідэнцкіх выбараў. Забароненыя беларускія і папулярныя польскія выканаўцы спявалі і ігралі польскія „бунтарскія" песні васьмідзесятых гадоў.

— Беларусь таксама мусіць перамагчы, — казала перад тэлекамерамі ў прамым эфіры акцёрка Іаанна Шчапкоўская, тая, што гады таму ў Польскім тэлебачанні абвясціла канец камунізму.

Ігралі, між іншым, „Н.Р.М." з Лявонам Вольскім, а Аляксандр Кулінковіч з „Нейра-Дзюбеля" спяваў „Люблю свабоду, люблю свабоду і разумею". На канец супольна адспявалі (м.інш. Кася Камоцкая і Юрка Асеннік) культавую польскую песню „Przeżyj to sam". Раней Анджэй Вайда пераконваў:

— Добра робіце. Там, дзе моладзь, там перамога. Я дажыў данясення намі свабоды і моманту, калі мы пераймаемся таксама свабодай іншых.

Хваляванне выклікала паяўленне на сцэне і выступленне студэнта Франка Вячоркі, былога вучня распушчанага ўладамі Гуманітарнага ліцэя імя Я. Коласа ў Мінску, сына прабываючага ў арышце лідэра Беларускага народнага фронту і шэфа выбарчага штаба Аляксандра Мілінкевіча Вінцука Вячоркі. Тысячы сабраных на Новым рынку захаплялі ся Мішам Рэуцкім і Паўлам Супаненкам, раперамі (вучнем і выпускніком Гуманітарнага ліцэя), якім, незалежна ад перашкод, удалося запісаць віэдэа-кліп у Мінску, а яго канцоўку — на паўвостраве Гель.

— Я хацеў, каб адчуваўся дух свабоды, — сказаў аўтар ідэі кліпа Макс Русць.

У дзень пачатку датэрміновых прэзідэнцкіх выбараў і ў рамках дзён салідарнасці з Беларуссю на дарозе да пагранперахода ў Кузніцы-Беластоцкай павіслі банеры з партрэтамі адзінага кандыдата ад апазіцыі Аляксандра Мілінкевіча ды рэкламай Радыё „Рацыя". Згуртаванне Маладых дэмакратаў, моладзевай групоўкі Грамадзянскай платформы, Беларускае аб'яднанне студэнтаў, Беларускі саюз моладзі і студэнтаў пад крыламі Грамадзянскай платформы ў гэты дзень сарганізавалі акцыю распаўсюджвання выбарчых лістовак: „Аляксандр Мілінкевіч: Прэзідэнт, якім зможаце ганарыцца". Шмат шафёраў і пасажыраў, прынамсі да пагранперахода, захоўвалі іх за шклоачышчальнікамі і за шыбамі з сярэдзіны аўтамашын. Былі і такія, як адзін вадзіцель, які адразу, уключыўшы шклоачышчальнікі, скінуў улётку са свайго аўто на дарогу.

— Гэта няпраўда, што Лукашэнку падтрымлівае больш за 80 працэнтаў беларусаў. Людзі, аднак, баяцца выходзіць на дэманстрацыі, страйкі, бо іх могуць арыштаваць. Можа, пры Мілінкевічы будзе лепш. У фабрыках, установах, бальніцах людзей прымушаюць галасаваць за Лукашэнку. Калі не, кажуць, застанешся без працы, — адважна прызнавалася 50-гадовая Жана з Гродна, у якой муж па паходжанні паляк.

Шмат іншых паўтаралі:

— Ад дабра ў Польшчу не ездзім. Усё ў нас ужо страшэнна дарагое.

— Я аддам свой голас за Мілінкевіча. Ён нармальны чалавек. А не пайсці на выбары баімося, бо яшчэ нас зняволяць, — казала маладое сужонства на старэнькім заходнім аўто з беларускай рэгістрацыяй.

— Трэба шмат змяніць, — прызнаўся 60-гадовы спадар Міхаіл.

Але было і так:

— Чаго вы ўмешваецеся. Нам з Лукашэнкам добра, — нервова кінула ў бок журналістаў пажылая беларуска і ўцякла ад фотаўспышак апаратаў і тэлекамер.

Некаторыя, убачыўшы тэлекамеры, адразу вярталі лістоўкі.

— Чаго вы ад мяне, старое, хочаце?! Мне ўжо нічога не трэба.

[працяг ☞ 5]

Не толькі вера ☞ 2

Яўген Вапа

На працягу ўсяго выбарчага фарсу штодзень даводзілася мне атрымоўваць весткі аб затрыманнях маіх знаёмых і сяброў. І не былі гэта хуліганы. Гэтыя людзі сапраўды хочуць беларускага дому і незалежнай дзяржавы. Дзякуй Вам за тое, што сваёй ахвярай напярэдадні Акту 25 Сакавіка ўлілі Вы таксама надзею і ў сэрцы беларусам па-за межамі Бацькаўшчыны...

Выбары ў Маскве ☞ 2

Уладзімір Лапцэвіч

Аддаўшы голас за Аляксандра Мілінкевіча, я падышоў да стала, дзе сядзелі назіральнікі. Было вельмі цікава даведацца, ад якіх яны арганізацый? Але гэтага не ўдалося высветліць. Жанчына, у якой я запытаўся, паведаміла, што яны грамадскія (!?) назіральнікі...

Царскія хаўтуры ☞ 3

Ева Сцепанюк

Юрка Карасюк памёр нечакана для сябе самога. Мрэц са здзіўленым абліччам сядзеў на лавачцы тры-чатыры гадзіны і не прыцягнуў нічыёй увагі. Першы пабачыў яго дурны Яшка, які доўга таптаўся ля нябожчыка і прасіў у таго папяроску. Пасля лётаў ад хаты да хаты і прадказваў нейкі баль...

Алімпіяда ☞ 8

Аляксей Мароз

27 белліцэістаў, якія дайшлі да апошняга этапу алімпіяды, распачалі спаборніцтва за званне лаўрэата па пісьмовых працах на адну з чатырох прапанаваных тэм. Так, як і ў час раённых элімінацый, вучням прапанавалася паказаць умеласці і веды па творчасці Максіма Багдановіча...

Люся Анхім ☞ 9

Міра Лукша

Люся памерла 3 сакавіка 2004 г., дзевятнаццаць гадоў ад свайго дэбюту на літаратурнай старонцы „Белавежы". Людміла Анхім была тады вучаніцай бельскага белліцэя. Перанеслася з эканамічнага ліцэя ў беларускі, пісала ў „Ніву", ліставала з рэдактаркай Верай Валкавыцкай, з Львом Стагановічам з Амерыкі. Пасля атэстату сталасці пайшла на беларускую філалогію...



Ёсць не толькі вера

Пішу гэтыя словы ў панядзелак, пасля гарачага выбарчага вечара ў Беларусі. І хаця Цэнтральная выбарчая камісія ўжо паспела вуснамі сваёй залатавуснай старшыні Лідзіі Ярмошынай апавясціць самую бліскучую перамогу свайго першага, то аднак пададзеныя ёю вынікі не ўвялі мяне ў змрочны адчай. Наадварот, тое, што цягам апошніх тыдняў прыйшлося мне назіраць у Беларусі, дае беларускаму народу надзею на свабоду, праўду і справядлівасць. Ненасытнасць Аляксандра Лукашэнкі на атрыманне як найбольшага выніку вывела яго і ягоных злодзеяў выбарчага выніку па-за межы звычайнай прыстойнасці. А за гэта раней ці пазней трэба будзе ім глянуць не толькі ў люстэрка, але і ў вочы незалежных судоў. Усе яны прайгралі ўжо не перад міжнароднай супольнасцю, але перад сваім народам. Беларуская грамадскасць, нягледзячы на рэпрэсіі, паказала, што хоча перамен і выгукнутыя ад сэрца і душы словы „ганьба" на Кастрычніцкай плошчы ў адрас рэжыму абазначаюць яго канец. І не паможа нават Ярмошына. Пры нагодзе асобы гэтай панечкі здзіўляе мяне „пануючы больш за дванаццаць гадоў на журналісцкіх салонах" (даўжэй за Лукашэнку!) у беларускай сталіцы карэспандэнт амаль усіх польскіх СМІ Валодзя Пац, які да гэтай пары хіба толькі ў рамках пратэсту не вывучыў прозвішча старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі, паслядоўна называючы яе ў сваіх карэспандэнцыях Лідзіяй Ярмошын. Такім чынам можна сабе гэта тэарэтычна ўявіць, што Валодзя пакідае ёй адкрытыя дзверы ў Еўропу. Спасылаючыся на ягоныя карэспандэнцыі, еўрапейскія памежнікі спакойна могуць даць дазвол уезду Ярмошынай, а нейкую Ярмошын могуць турнуць з разяўленым ротам з мяжы і замарозіць яе банкаўскія замежныя рахункі.

На працягу ўсяго выбарчага фарсу штодзень даводзілася мне атрымоўваць весткі аб затрыманнях маіх знаёмых і сяброў. І не былі гэта хуліганы. Гэтыя людзі сапраўды хочуць беларускага дому і незалежнай дзяржавы. Дзякуй Вам за тое, што сваёй ахвярай напярэдадні Акту 25 Сакавіка ўлілі Вы таксама надзею і ў сэрцы беларусам па-за межамі Бацькаўшчыны. У пятніцу 17 сакавіка ў сям'і маіх сяброў нарадзіўся сын. Аднак, шчасце было няпоўнае, таму, што бацька не мог наведаць сваіх найбліжэйшых. Ён проста мусіў скрывацца перад міліцыяй толькі таму, што марыцца яму лепшая будучыня для сваіх дзяцей. А тыя людзі, якія былі арыштаванымі, выкінутымі з працы, са школы — ці ў іх няма блізкіх, бацькоў, каханых? За адвечнае права на волю, рэжым пазбаўляе гэтых людзей волі, не гаворачы ўжо аб праве на выбар. Зневажае таксама свой народ. У такой сітуацыі поўнымі цынізму і фарысейства з'яўляюцца словы беларускіх дыпламатаў у Польшчы пра роўныя шанцы кандыдатаў і свабоду слова. Людзі ў Беларусі адчуваюць патрэбу салідарнасці. Гэта натуральнае. Але сапраўдная салідарнасць гэта не толькі бяспечныя пратэсты на мяжы ў суседніх краінах, удзельнікам якіх нічога не пагражае. Салідарнасць гэта не толькі танцы і гульні пры добрай музыцы (хаця і гэта патрэбнае), але менавіта пастаянная, матэрыяльная дапамога пацярпелым і іх сем'ям. Усім. Гэтым вядомым у свеце і тым пражываючым у самых малых раёнах Беларусі. Баюся, каб „мода" на Беларусь не прайшла з заканчэннем выбараў, каб беларускае грамадства не засталося пакінутым на волю лёсу і ўзмоцненай дыктатуры Аляксандра Лукашэнкі. Тады ён можа сабе бясконца ладзіць сваё чортавае вяселле.

Для нас, беларусаў у Польшчы, інфармацыйная кампанія пра беларускія падзеі мае свае станоўчыя бакі. Па-першае, хіба толькі ўжо шызанутыя могуць аспрэчваць, што за ўсходняй мяжой краіны жыве беларускі народ і існуе яго дзяржава. Жыхары Польшчы даведаліся пра гістарычную і незалежную нацыянальную сімволіку. Для нашых беларускіх вучняў быў гэта таксама добры ўрок гісторыі і выхаду з нацыянальнай моўнай і культурнай закамплексаванасці. Хацелася б, каб засвоілі яго таксама бацькі і настаўнікі. Шанц напэўна ёсць. Перад намі вясна. Перад намі святкаванне Акту абвяшчэння ўгодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі 25 сакавіка 1918 года. Калі ёсць ідэя, тады і будзе перамога.

Яўген Вапа

Галасаванне ў Маскве

У сталіцы Расіі для грамадзян Беларусі былі адчыненыя чатыры ўчасткі для галасавання — у Маскве, Калінінградзе, Краснадары і Пецярбургу. Пэўна, галоўным з іх быў участак у беларускім пасольстве ў Маскве. Менавіта туды, на вуліцу Марасейка,17 прыйшлі галасаваць беларусы, якія знаходзіліся ў гэты час у расійскай сталіцы ці пражываюць непадалёк ад яе. Падышоўшы да пасольства недзе а другой гадзіне дня, я быў уражаны натоўпам, які стаяў уздоўж муру пасольскага будынка аж да суседняга пятнаццатага дому. Як аказалася, гэта была чарга жадаючых прагаласаваць. Яна цягнулася метраў на трыццаць і людзі стаялі ў шэрагах па дзве-тры асобы. На маё пытанне ці прагаласаваць могуць толькі стала пражываючыя ў Расіі грамадзяне Беларусі, людзі адказалі, што галоўнае, каб пры сабе меўся беларускі пашпарт. Месца сталага пражывання значэння не мела, што ўжо паказвала на магчымасць узнікнення недакладнасцей пры падліку галасоў. Бо пры дзеючым інстытуце „датэрміновага галасавання", які існуе ў беларускім выбарчым заканадаўстве, пры жаданні не цяжка прагаласаваць па месцы жыхарства ў Беларусі, а потым зрабіць тое ж самае, прыехаўшы ў Расію.

Па маіх візуальных ацэнках, сярэдні ўзрост прыйшоўшых галасаваць быў каля 25-28 гадоў. Гэта зразумела, бо сярод іх была вялікая колькасць студэнтаў, што вучацца ў маскоўскіх універсітэтах. Таксама было многа маладых жанчын нестудэнцкага ўзросту, якім, звычайна, на падобныя мерапрыемствы хадзіць нецікава. Былі і людзі сярэдняга веку. Стаўшы ў чаргу, я апынуўся побач з мужчынам з сынам-падлеткам і студэнтам, на правай руцэ якога была павязана сіняя павязка. Каб нехта ўголас выказваў падтрымку дзеючаму прэзідэнту чуваць не было. З размоў у чарзе запомніліся выказванні маладых хлопцаў аб тым, што больш за два тэрміны кіраваць шкодна, няхай, маўляў, іншыя пакіруюць. Побач стаяўшы мужчына з сынам казаў, што мы маем аналаг іспанскай дыктатуры Франка, які ўпраўляў 40 гадоў. З таго, казаў мужчына, вынік зразумелы, але трэба неяк выказацца аб існуючай сітуацыі ў Беларусі.

Мая чарга ўвайсці ў пасольства прагаласаваць падышла праз гадзіну і дзесяць хвілін пасля таго, як я ў яе стаў. Прайшоўшы праз браму-металашукальнік, я апынуўся ў холе, адкуль прайшоў у залу для галасавання. Мяне нідзе ў спісах не было, але гэта ніякім чынам не засмуціла членаў камісіі, якія хутка мяне туды ўпісалі і выдалі бюлетэнь. Раптам пачуўся голас кагосьці з камісіі, што бюлетэні ўжо не ўціскваюцца ў скрыню для галасавання. Сапраўды яна была невялікая — ад падлогі крыху вышэй калена. Пакуль я галасаваў у кабінцы гэтую недарэчнасць неяк выправілі, бо мой бюлетэнь лёгка ўвайшоў у шчыліну.

Аддаўшы голас за Аляксандра Мілінкевіча, я падышоў да стала, дзе сядзелі назіральнікі. Было вельмі цікава даведацца, ад якіх яны арганізацый? Але гэтага не ўдалося высветліць. Жанчына, у якой я запытаўся, паведаміла, што яны грамадскія (!?) назіральнікі. Шчыра кажучы, я не спадзяваўся пабачыць там даверaных асоб кагосьці з кандыдатаў, але назіральнікі не могуць быць ніякімі іншымі як грамадскімі, бо вылучае іх якая-небудзь грамадская арганізацыя, да якіх належаць і партыі. Стаяўшы побач мужчына, відаць пасольскі супрацоўнік, распавёў, што за галасаваннем у пасольстве назіраюць вылучэнцы дзвюх расійскіх арганізацый і, скорагаворкай назваўшы іх, кудысьці пайшоў. Беларускія арганізацыі не вылучалі назіральнікаў на даны ўчастак. Вельмі дзіўна, што самі назіральнікі, зважаючы на адказ, не маглі дакладна распавесці, хто іх вылучыў. Гэта навяло на сумныя думкі аб даным назіранні.

Асэнсоўваючы свае ўражанні ад удзелу ў галасаванні прыйшоў я да высновы, што беларускае грамадства ўжо не знаходзіцца ў палітычнай спячцы як на папярэдніх выбарах. Бачачы мноства магчымасцей для фальшавання выбараў, якія, з поўнай упэўненасцю можна сказаць, будуць выкарыстаныя, звяртаць увагу на афіцыйныя працэнты „выбараў Аляксандра Лукашэнкі" няварта. Больш важна іншае — беларусы становяцца ўсё больш падрыхтаванымі да ўспрыняцця дэмакратычных каштоўнасцей і гэта на сёння з'яўляецца галоўнай заслугай тых, хто гэтыя каштоўнасці мужна адстойвае.

Уладзімір Лапцэвіч (Масква)

Вачыма еўрапейца

Бел-чырвона-белая Польшча

На хвалі перамогі Аранжавай рэвалюцыі палякі тыдзень да прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, таксама ў адносінах да гэтай краіны, выплачвалі доўг удзячнасці за дапамогу іншых краін у дэмакратычных пераменах у Польшчы ў васьмідзесятыя гады і выказвалі сваю салідарнасць з беларускімі дэмакратамі. Часам я, аднак, не мог пазбыцца ўражання, што за актамі салідарнасці ў іх чыстым відзе стаяла пачуццё гістарычнай місіі, у рамках якое частка палякаў прыпісала сабе ролю збаўцаў прыгнечанага свету, а канкрэтна апошняй дыктатуры ў Еўропе. Выразіў гэта моцна жыхар вёскі Бялкі Мікалай Лук'янюк у выказванні для Тэлебачання Беласток: „Я адчуваю неспакой, што нашы ўлады занадта там умешваюцца".

Разумею, што слова „ўлады" гэта нейкае скарачэнне. Фактычна, аднак, амаль кожны палітык і грамадска-палітычны дзеяч пажадалі выказаць сваё супольнае адчуванне з беларусамі. На канвенцыях, распачынаючых самаўрадавую выбрачую кампанію ПіС і Грамадзянскай платформы лідэры гэтых партый аднесліся таксама да сітуацыяі ў лукашэнкаўскім анклаве Еўропы.

— Мы верым, што світанак на Беларусі хутка надыдзе, — запэўніваў старшыня кіруючага Польшчай Права і справядлівасці Яраслаў Качынскі.

У Беластоку ўжо дзве гадзіны да заканчэння выбараў Згуртаванне Малады цэнтр пад помнікам Юзафу Пілсудскаму справіла „паховіны дэмакратыі" з выстаўленнем „кнігі спачуванняў". Сабралі больш за дзве тысячы подпісаў салідарнасці. Пасля маладыя людзі паявіліся пад консульствам РБ. Раней у выбарчую нядзелю на мяжы больш за сотня маладых людзей, асабліва з моладзевых груповак ПіС і ГП скандіравалі і спявалі. Былі гэта галоўным чынам маладыя людзі, якія не атрымалі згоды на выезд на беларускія выбары. Зацікаўленне перасякаючых граніцу беларусаў было невялікае, бо такі быў якраз рух на мяжы.

— Дэмакратыя ў Беларусі патрэбная таксама і палякам, каб рабіць добрыя эканамічныя і палітычныя інтарэсы, — казаў прымаючы ўдзел у акцыі віцэ-маршалак Сената Кшыштаф Путра.

У нядзелю справілася з заданнем Радыё Беласток і навіны аб сітуацыі ў Беларусі Яраслаў Іванюк чытаў таксама па-беларуску. У Варшаве зараз пасля заканчэння выбараў пачалася маніфестацыя перад беларускім пасольствам. Пару дзён стаяла тут палатка — інфармацыйны пункт. Прыдумаў разбіць яе тут Антось Цялежнікаў, старшыня Звязу на карысць дэмакратыі ў Беларусі. Раней у варшаўскім клубе „Гібрыды" выступілі гурты ў рамках канцэрта „Салідарныя".

— Калі не ў гэты раз, то раней ці пазней на Беларусь прыйдзе свабода, — быў упэўнены вядомы артыст кабарэ Ян Петшак.

Уражанне выклікала спяваючая па-беларуску Ілона Карпюк з гурту „5set5", у гэты раз выступаючая з „Рімай" з Гарадка.

Пасля шматлікіх акцый салідарнасці і пасля прэзідэнцкіх выбараў стане перад палякамі і іншымі еўрапейцамі пытанне: ці цяпер пасля выбараў палякі зноў забудуць аб Беларусі, як гэта бывала ў апошнія гады кіравання Аляксандра Лукашэнкі? Як цяпер далей весці сябе? Што і як рабіць, каб адважныя і свядомыя беларусы не засталіся ў адзіноце, а ўвесь беларускі народ пераканаўся, што прынцыпы свабоды і дэмакратыі гэта не нейкая выдумка, якая ўвапхне іх выключна ў беднасць, беспрацоўе і хаос?

Мацей Халадоўскі

Царскія хаўтуры

Юрка Карасюк памёр нечакана для сябе самога. Мрэц са здзіўленым абліччам сядзеў на лавачцы тры-чатыры гадзіны і не прыцягнуў нічыёй увагі. Першы пабачыў яго дурны Яшка, які доўга таптаўся ля нябожчыка і прасіў у таго папяроску. Пасля лётаў ад хаты да хаты і прадказваў нейкі баль. У бок дурнога ўдовы пасылалі дулі або затыкалі яму рот скібкай пірага з цукрам.

Пад вечар Карасюка знайшла маці.

— Што сядзіш як затычка ад пекла, — накрычала спачатку старая...

Пасля па вуліцы, рыхтык як у які пажар, раздаўся пранізлівы бабскі віск. Гэта быў пачатак вялікага зрыву, які тры дні і тры ночы запанаваў у Н. і які без сумнення можна назваць найбольшай падзеяй за апошнія дзесяць гадоў.

* * *

Праз дваццаць хвілін у Н. зноў пачулі роў. У гэты раз па брукаванай вулачцы імчала хуткая дапамога. Не ўсе яшчэ паверылі ў смерць Юрася Карасюка, нават калі лекар пацвердзіў на паперы скон.

Але ўжо тады ў рух пайшлі тэлефоны, бабулі званілі сваім дочкам, тыя, у сваю чаргу, перадавалі навіну далейшым сваякам і знаёмым ды ўсім хросным дочкам і сынам, якіх асіраціў Карасюк. Звестка пра здарэнне ў дрымучай і забытай вёсачцы на працягу першай гадзіны даляцела ў Аўстралію.

Нейкія дзве гадзіны пазней, сярэдзінай вуліцы, басанож, імчала Шурка С. Удава толькі што ачуняла ад двухтыднёвага запою.

— Ах, мой саколік! Мой родненькі! Для каго ты нас бедных пакінуў?! — луналі пад неба яе журботныя галашэнні.

Пад уплывам ляманту, які выклікаў дрыжыкі на спіне і наклікаў плач, у вёсачцы зараўлі дзве апошнія каровы.

Аднак да гэтай пары дзве найстарэйшыя ўдавы паспелі ўжо памыць мерцвяка. Апранутага як на шлюб Юрася, з кальцом са штучнага золата, паклалі на покуці.

— А я дапільнавала, каб ніхто вады не свіснуў, — скажа пасля ў таямніцы старажылка Сонька Ш.

У Н. ведае стары і малы (хоць тых апошніх як на лякарства), што ля хаўтураў труцца аматары чорнай магіі. Самым вялікім для іх выклікам ёсць пакража вады, у якой мыюць нябожчыка.

— З такой вадой лёгка чалавека або жывёлу са свету звесці, — асцерагае добрая старажылка.

Пасля апошняй звесткі я *адлятаю* на Філіпіны.

* * *

Раніцай, недзе ў сем гадзін, над вёсачкай зноў раздаўся адчайны віск. У гэты раз калолі парсюка пад памінальную абедню. Яшчэ ўначы, калі бабулі сядзелі ля пакойніка і пялі яму „Кажут людэ, што я ўмру", чыталі галашэнні са старых сшыткаў, у якіх перапісаны хаўтурныя творы, актывізавалася мужчынская талака. Старыя кавалеры, у тым ліку Ёзік Дрозд і Слава Касцюк, пазлівалі з усіх бунькаў брагу, якую знаходзілі ці то на печы, ці то ў кацубніку пенсіянераў і выгналі тры вёдры самагонкі. Раніцай пагналіся яшчэ ў лес і насеклі поўны воз фашыны, якой выслалі панадворак памерлага. Каб прыгожа пахла.

З раніцы да вечара ў Н. панавала небывалае ажыўленне. У гэты дзень наймалодшыя элегантці адправіліся ў мястэчка, каб зрабіць перманентную завіўку. Вядома, паводле афіцыйнай версіі, кабеты спяшаліся па жалобны вянок — такія аздобы заказалі, здаецца, з кожнага двара.

Фота УЛАДЗІСЛАВА ЗАВАДСКАГА

На смерць Юрася Карасюка адгукнуліся і ўласнікі аб'язных крамаў. Апрача хлеба і цукру сёння прапанавалі яны лампадкі, пластмасавыя букеты з надпісам „Ostatnie pożegnanie", чорныя бабскія калготы.

* * *

Пасля абеду, у час калі завяршаецца працоўны дзень, у Н. пачалі з'язджацца гарадскія сваякі. Машыны імчалі адна за адной, а пасля іх можна было сустрэць ля кожнай старэнькай хаткі, рыхтык у Вялікдзень. Праўда, пасля ўскладзення ля труны кветак або вянка, многія адразу вярталіся ў горад на начлег. Толькі старажылкі і найбліжэйшая сям'я — сёстры, браты і маці трымалі ўсю ноч варту ля нябожчыка.

— Няма большага гора, чым пахаваць дзіця, — каментавалі па баках лямант і роспач маці, які ўспыхаў прыблізна сем разоў на гадзіну.

Час ад часу ўзрываліся спантанныя галашэнні і сярод аднавяскоўцаў. У гэтай справе ярка вылучалася згаданая ўжо ўдава Шурка С. У галашэннях успаміналіся толькі станоўчыя рысы памерлага. Сам Юрась, каб жыў, дык дзіваваўся б гэтым раптоўным і квяцістым захапленнем ягоным пройдзеным шляхам. У жыцці па-рознаму бывала, асабліва ў час апошніх дваццаці гадоў, калі на маразм і дэпрэсію, выкліканую пастаяннымі паховінамі, у Н. мелі адно лякарства — запой. Але Юрась і тут меў сваю шляхетную місію.

— Нават у час, калі стаў лізаць дэнатурат, меў свой людскі клас, — скажа пасля Ёзік Дрозд. — Ён уставаў з-за стала або з лаўкі на зважай і прапанаваў небанальны тост: *За шчасце і волю беларусаў!*

Гэты тост *новапрадстаўлены Георгій* меў пачуць яшчэ ў часы дзяцінства ад свайго дзеда, *балахоўца*.

* * *

Праўда, мала каму з прыезджых падабалася, што Карасюка хаваюць свае людзі, значыць, вяскоўцы. Асабліва гарадскія круцілі насамі:

— Пахавальная фірма пахавала б яго ў белых рукавічках!

Юрася Карасюка пахавалі на трэці дзень пасля смерці, калі з'ехаліся ўжо з цэлай краіны і з замежжа сваякі. Сама магіла напамінала піраміду. Аблажылі яе гурбой пластмасавых вянкоў, як пасля з зайздрасцю будуць паўтараць у Н. — як па нейкім епіскапе. Сам бацечка, з якім сям'я таргавалася наконт ганарару за паховіны, назначаную суму аргументаваў словамі: „Я ж яго як самога цара вам пахаваў!"

Афіцыйныя хаўтуры закончыліся рытуальным спажываннем канону і шчодрым абедам, які цягам двух дзён смажылі і гатавалі сваячкі і знаёмыя — таксама дружнай талакой. Цягам гадзіны на стале паставілі звыш пяцідзесяці мясных, рыбных і салодкіх страў. Былі галубцы і першасныя каўбасы, адбіўныя катлеткі і бігас, селядцы і рыба на пяць спосабаў, салаты з гародніны і экзатычных пладоў, пончыкі і далікатныя пірагі з крэмавымі і шакаладнымі начынкамі.

Пры стале, згодна з традыцыяй, выпілі па тры кілішачкі, а пасля ўсе разышліся па дамах.

— Які слаўны *погжэб* вы Юрасю справілі, — гаварылі на развітанне ўдзельнікі сумнай гасціны.

Яшчэ ў той самы дзень у хаце пакойніка жанчыны спалілі смецце і памылі падлогу.

* * *

Памінанне *новапрадстаўленага* працягвалася пасля ў наваколлі бара „Амазонка". У спітай кампаніі ўсё выхвалялі шляхетнасць і непаўторнасць памерлага. Дзеля апошняй справы пайшлі ў рух згаданыя ўжо тры вёдры самагонкі, якую распівалі-выпівалі калейкай, парцалянавай філіжанкай без вушка. Тут жа адбывалася і свайго роду тусоўка са смерцю:

— Цяпер чарга на мяне, — роў дзікім голасам Ёзік Дрозд. Яго змрочную перспектыву меў прадвяшчаць апошні сон. Менавіта Дразду, як першаму, прысніўся мярцвяк. Юрась ехаў фурманкай па вуліцы і спыніўся каля яго хаткі. Зрабіў каля сябе месца і рукой заклікаў да сябе.

— У нас *добро, вясёло!*, — заахвочваў калегу прысесці побач. Сон Ёзіка разгадалі ў Н. адназначна, з-за чаго налівалі яму большыя дозы самагонкі.

Адчайная п'янка, у час якой мяшаліся слёзы і песні тыпу „Тапаля-тапаля", доўжылася яшчэ два тыдні. Ніхто не прыкмеціў як памерла старая Палашка. Хоць... яе хаўтуры не цікавілі кампанію.

— Яе пахавала фірма ў белых рукавічках!

Ева Сцепанюк

Пчаляры

4 сакавіка г.г. адбыўся справаздачна-выбарчы сход членаў раённага гуртка пчаляроў у Гайнаўцы. Удзельнічалі ў ім 60 чалавек. Старшыня праўлення гуртка Анатоль Філіпчук перш-наперш адзначыў паспяховую арганізацыю абучэння пчаляроў. Заняткі вяла д-р Іаланта Пекут. Тэма іх: „Усё пра мёд". Аказваецца, не ўсе ведаюць, які мёд самы высакаякасны. А ён — адна з найбольш цэнных і непаўторных пажыўных субстанцый, якіх дастаўляе нам натура.

Пчалярства ў Гайнаўскім павеце раздробненае. Сярэдняя велічыня пасек — 30 сем'яў. Але ёсць пчаляры, якія маюць па 100, 150 і 200 пчаліных сем'яў. Мёд з чыстага рэгіёна Белавежскай пушчы мае ўсе натуральныя вартасці, пах і выразны смак.

Гайнаўскія пчаляры пастанавілі мець свой рэгіянальны прадукт — мёд „Белавежскі ліпень". Зараз апрацавалі статут і выбралі фірменны знак. Будзе гэта мёд з квітнеючых ліпаў. Паспрабаваць яго будзе можна сёлета ў жніўні на Мёдавым фэсце ў Белавежы.

Пчаляры абмеркавалі шмат арганізацыйных спраў. Выбралі, між іншым, новую рэвізійную камісію. Старшынёй яе стаў Юрый Дронь з Белавежы. Шмат часу прысвяцілі, куды збіраюцца ехаць на экскурсію.

Апрача таго ім паведамілі пра сем пасек у краіне, у якіх можна купіць пчаліных матак. Гэта:

1. Мар'я Вільдэ 10-713 Ольштын, вул. Ксенжыцова 8;
2. Мар'я Гембаля, Жэлькаў-калёнія, 08-110 Седльцы, вул. Акацыёва 57;
3. Пасека племянная ў Жэлькаве, 08-110 Седльцы;
4. СГ і УЗ у Быдгашчы, Племянная пасека ў Пажневе, вул. Пшышласці 1, 05-800 Прушкаў;
5. ВОДР у Любліне, Дапаможная гаспадарка ў Коньскаволі;
6. ІСК Аддзел пчалярства, вул. Казімерская 2, 24-100 Пулавы;
7. Кшыштаф Лоц, Тэадораў 57, 08-114 Скужэц.

Калі пчаляр закажа маткі па-за вышэйпрадстаўленым спісам рызыкуе, што не атрымае датацыі.

(мох)

Караюць усіх

Аказваецца, паліцыя не мае права выяўляць прозвішча п'янага шафёра, бо гэта парушала б яго асабістае дабро. За гэта могуць судзіць паліцыянта, калі ён такое зробіць. На маю думку, няма ў нашай дзяржаве добрых законаў і яшчэ доўга не будзе. Калі пракурор абвінавачвае злачынцу ў судзе, а суддзя асуджае, то іхныя прозвішчы выяўленыя для ўсіх, а прозвішча злачынцы не выяўляецца. Гэта значыць, што нашае права бароніць усялякай масці злачынцаў, толькі не звычайных, спакойных грамадзян. Добра, што паліцыянты дарожнага руху могуць затрымоўваць нецвярозых парламентарыяў і правяраць іх алкаголемерам, і што ад снежня 2005 г. у такіх сітуацыях яны не маюць ужо права засланяцца імунітэтам.

Мікалай Лук'янюк

Наш беларускі старшыня

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Інтэрв'ю з Яўгенам ЯНЧУКОМ, старшынёю Клуба радных Беларуска-народнага выбарчага камітэта ў Радзе горада Гайнаўка, настаўнікам гісторыі Гайнаўскага белліцэя.

— Восенню гэтага года павінны адбыцца чарговыя самаўрадавыя выбары і жыхары Гайнаўкі пры дапамозе выбарчых бюлетэняў ацэняць дзейнасць паасобных радных. Якога прынцыпу ў сваёй працы трымаўся Клуб радных БНВК, каб не страціць даверу выбаршчыкаў і здабыць новых прыхільнікаў?

— Адзін радны мае малое ўздзеянне на працу рады. Важна, каб працаваць супольна. Радныя Беларускага клуба працавалі актыўна ў камісіях і на пасяджэннях рады. Мы былі адкрыты на прапановы жыхароў горада і арганізацый. Калі прыходзілі да нас людзі, мы з імі гаварылі і стараліся вырашаць разнародныя справы, якія краналі нашых жыхароў. Зацікаўленыя размовай кантактаваліся з намі ў памяшканні Беларускага форуму самакіравання ў РП.

— Выбаршчыкі заўсёды спадзяюцца, што новаабраныя заканадаўчыя і выканаўчыя ўлады палепшаць умовы жыцця ў горадзе. Што за апошні тэрмін удалося зрабіць у Гайнаўцы ў гэтай галіне?

— У апошнім скліканні рэалізаваных было многа інвестыцый. Быў перабудаваны і разбудаваны гарадскі амфітэатр. Збудавалі скейтпарк, дацяплілі і атынкавалі будынкі Комплексу школ н-р 1 і Дзіцячага садка ў квартале Міленіюм. Было мадэрнізаваных шмат дарог распаложаных у жылых кварталах і пасля было пакладзенае асфальтавае палатно. За апошні час пракладзена шмат каналізацыйных трубаў і зараз горад сканалізаваны ў 80 працэнтах. Нядаўна апошнія жылыя кварталы былі падключаны да вялікай цеплаэлектрастанцыі, якая зараз пастаўляе цяпло на ўвесь горад. Побач вялікіх інвестыцый праводзіліся таксама меншыя. Рамантаваліся жыллёвыя будынкі, дарогі і тратуары.

— Ці ўдалося раздабыць многа сродкаў на інвестыцыі па-за гарадскім бюджэтам?

— За 2005 год Гайнаўка пасля Беластока, Ломжы і Сувалкаў першынствавала ў ліку гарадоў, якія на інвестыцыі атрымлівалі найбольш еўрасаюзных сродкаў.

— Якія інвестыцыі неабходныя ў горадзе на бліжэйшую будучыню?

— Трэба надалей паляпшаць дарожную інфраструктуру і завяршаць будову каналізацыйнай сеткі. Неабходна рамантаваць школьныя будынкі. У ліпені гэтага года пачнецца будова крытага басейна побач спартыўнай залы нашага ліцэя. Калі будзе больш сродкаў, тады будзем рашаць, як іх разумна выдаткоўваць.

— Зараз у Гайнаўцы вялікае беспрацоўе. Што ўдалося зрабіць у горадзе за апошні тэрмін дзеля стварэння новых месцаў працы?

— Беспрацоўе гэта хвароба ўсёй краіны. Дзейнасць мясцовага самакіравання ў гэтай галіне вельмі абмежаваная законамі і ўздзеянне гарадскіх выканаўчых улад на рынак працы вельмі невялікае.

— Аднак мясцовыя самаўрады змагаюцца з беспрацоўем нягледзячы на свае магчымасці.

— Можна пасрэдна паўплываць на рынак працы паніжаючы падатак ад нерухомай маёмасці, аказваючы падтрымку інвестарам і распаўсюджваючы рэкламу. Падаткі ў Гайнаўцы самыя нізкія ў параўнанні да падобнай велічыні гарадоў нашага рэгіёна. Наш горад выступае з рэкламай на разнародных выстаўках. Нашы ўлады ствараюць добрыя ўмовы для прыцягнення інвестыцый і яны трапляюць у наш горад. Самай вялікай інвестыцыяй была будова маркета „Кауфлянд", у якім знайшлі месца працы нашы жыхары. Нядаўна вялікі ўчастак зямлі ў горадзе купіла прадпрыемства „Пронар" з Нарвы, якое збудуе на ім свой чарговы філіял. Прадпрыемствы дамаўляюцца з гарадскімі ўладамі аб адтэрмінаванні сплаты арэндных даўгоў, што дае магчымасць пазбегнуць ліквідацыі прадукцыі і захаваць месцы працы.

— Ці ёсць магчымасць прыцягнуць у Гайнаўку новых інвестараў, якія стварылі б новыя месцы працы?

— Распалажэнне Гайнаўкі на ўскраіне Белавежскай пушчы абмяжоўвае інвестыцыйныя магчымасці. Аднак побач пушчы падрыхтаваны тэрыторыі для стварэння турыстычнай інфраструктуры. Зараз ідзе будова вуліцы з гэтага месца ў цэнтр горада.

— У мінулым годзе быў прыняты закон аб нацыянальных меншасцях. Ці былі спробы прымянення яго на практыцы ў Гайнаўцы?

— Такіх спробаў не было, але Беларускі клуб рыхтуе пастанову, якая дазволіць занесці Гайнаўку ў лік мясцовасцей, у якіх пражываюць нацыянальныя меншасці. Пасля будзем разважаць, што рабіць далей.

— Нядаўна адна з гайнаўскіх вуліц атрымала імя вядомай журналісткі Тамары Саланевіч. Ці ёсць планы напомніць жыхарам горада пра вядомых беларускіх пісьменнікаў або нацыянальных дзеячаў, называючы іх прозвішчамі новыя вуліцы?

— Хацелася б больш адзначыць прысутнасць беларусаў у Гайнаўцы, называючы вуліцы імёнамі нашых славутых дзеячаў. Але апошнім часам не ўзнікла многа новых вуліц і не было такой магчымасці.

— Вы кіруеце Клубам беларуска-польскіх спраў „Граблі", да якога належаць белліцэісты. Як вялікае ўздзеянне мае ён на фарміраванне беларускай нацыянальнай свядомасці вучняў?

— Усе сябры клуба лічаць сябе беларусамі. Удзельнікі клуба маюць магчымасць выступаць на форуме школы, перад усім у час беларускіх святаў. Напэўна такія сустрэчы маюць уплыў на фарміраванне беларускай нацыянальнай свядомасці іншых вучняў. Клуб дапамагае таксама вучням пашырыць веды пра Гайнаўку, Беласточчыну і знаёміцца з новымі людзьмі.

— На занятках гісторыі вы спасылаецеся на падзеі з мінулага на нашых землях.

— Сёння не ўсе любяць вучыцца гісторыі. Аднак у нашай школе ёсць штораз больш моладзі, якая хоча даведацца пра мінулае сваёй сям'і, горада ці іншых мясцовасцей. Яны самі шукаюць гістарычных вестак пра Гайнаўшчыну.

— Вы стварылі праграму навучання па гісторыі Беларусі, якой можна карыстацца не толькі на ўроках гісторыі.

— У праграме навучання ёсць пытанні па гісторыі Беларусі ў агульным і дэталі, якія тычацца нашага рэгіёна. Можна выкарыстаць яе не толькі на занятках гісторыі, але знаёміць з мінулым на занятках беларускай мовы ці геаграфіі.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей Мароз

Салідарныя з Беларуссю

Канцэрт перад беластоцкай ратушай: высутпае гурт „5set5”

[1 ☞ працяг]

Дэпутат Роберт Тышкевіч (Грамадзянская платформа), старшыня парламенцкага калектыву ў карысць салідарнасці з Беларуссю пасля раздачы сваёй партыі лістовак сказаў:

— Кожнае слова ў абарону грамадзянскіх свабод, дэмакратыі, супрацьстаянне праследу трактуецца як умяшанне. Аднак, дэмакратыя маўчаць не можа. Кожны раз, калі будуць парушацца грамадзянскія правы, правы чалавека, будзем гаварыць поўным голасам. Пры нагодзе гэтай кампаніі ўсё ж штосьці прарвалася, і я веру, што гэта ўжо будзе трывалы набытак беларускай дэмакратыі.

І запэўніваў:

— Справа не ў тым, каб выбіраць за беларусаў. Мы за тым, каб беларусы маглі выбіраць у свабодных і дэмакратычных выбарах. Разумеем, аднак, тое, што змены не наступяць адразу.

Аб рашэнні польскага МЗС, якое да дня прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі не рашылася ўручыць назначэння паслу Польшчы ў Мінску Генрыку Літвіну, сказаў:

— Думаю, што гэта адпаведная пазіцыя. У сітуацыі, калі Польшча аплёўваецца афіцыйнымі беларускімі СМІ, не можа гэта астацца без адэкватных мераў з боку нашага МЗС. Антыпольская прапаганда ўжо даўно перакрочыла нормы дапушчальныя і абычаем, і міжнародным законам.

Моладзь сабраная перад пагранпераходам у Кузніцы скандзіравала „Mińsk — Warszawa — wspólna sprawa”. Маладыя палякі часам выкрыквалі лозунгі, якія часам выклікалі розногалоссе сярод перасякаючых мяжу: „Wolność na Białorusi — Łukaszenko odejść musi”, „Łukaszenko do kołchozu”.

Банеры Аляксандра Мілінкевіча і Радыё „Рацыя” павіслі таксама перад пагранпераходам у Бабруйніках ды на найбольшых беластоцкіх базарах і вялікіх крамах.

На Кастрычніцкай плошчы ў Мінску

Тры дні да выбарчай нядзелі — 16 сакавіка — у шмат якіх гарадах Польшчы і 20 краінах Еўропы праводзіўся „Дзень салідарнасці з Беларуссю” арганізаваны ад некалькіх месяцаў у знак пратэсту супраць арыштаў беларускіх апазіцыянераў. У гэты раз ва ўсёй Польшчы гэта былі канцэрты. У Беластоку спявала Ілона Карпюк і яе гурт „5set5”. Раней аднак акцыю перад беластоцкай ратушай сарганізавала Amnesty International. Збіраліся подпісы на лістоўках і на звітку ў пару дзесятках метраў каля дваццаццю маладымі людзьмі з Галандыі і Нямеччыны. Мэта: змаганне за захоўванне правоў чалавека ў Беларусі. Акцыя маладых заходніх еўрапейцаў праходзіла пад лозунгам „Да мяжы свабоды”. Адзін з яе ўдзельнікаў сказаў „Ніве”:

— Мы пераехалі аўтастопам больш за тысячу кіламетраў з Амстэрдама дзеля таго, каб наблізіцца да Беларусі. Няма ў нас уязной візы ў Беларусь. Беласток — гэта найбольшы горад распаложаны найбліжэй гэтай краіны. Гэта для нас сімвал. Якраз згэтуль хочам перадаць нашу петыцыю калегам з беларускай АІ. Можа ўдасца ім даручыць яе беларускім уладам.

І дадаў:

— Падтрымліваем людзей, якія змагаюцца за свабоду слова. Не займаемся палітыкай, толькі змаганнем за шанаванне правоў чалавека. Ведаем, аднак, што ў адзін дзень не зменім свету.

У гэты раз у перадвыбарчай акцыі салідарнасці з Беларуссю ў Беластоку ўзяло ўдзел каля 500 асоб. Сарганізавала яе паразуменне студэнтаў беластоцкіх вучэльняў. Вядучыя спатканне і канцэрт Роберт Францкевіч з сяброўкай пераконвалі са сцэны:

— Невыпадкова сустракаемся ў гэтым месцы. Беласток найбліжэй Беларусі. Хочам падтрымаць нашых каханых беларусаў, каб трымаліся!

Іаанна Далецкая з Вышэйшай школы публічнай адміністрацыі ў Беластоку заклікала:

— Заклікаю: адкрыйма ўсе вучэльні для нашых сяброў, студэнтаў з Беларусі. Хай Беласток стане універсітэтам свабоды для нашых суседзяў. Наша мэта — даць сведчанне салідарнасці з беларускім народам.

Запалалі свечкі і знічы салідарнасці. Маладыя людзі раздавалі белчырвона-белыя стужкі і джынсавыя банцікі — сімвал моладзевага руху ў змаганні за дэмакратыю. Для празяблых быў гарохавы суп, што найбольш „зацікавіла” журналіста і аператара беларускага дзяржаўнага тэлебачання. У фінале Дня салідарнасці паляцелі ў неба і, мабыць, на беларускую мяжу шары з пажаданнямі поспеху беларусам.

Тэкст і фота Раіны Стэфанчук

Беларусаў стала менш

Беларусаў стала на 49,9 тысячы чалавек менш, паведамляе Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь. Па стане на 1 студзеня 2006 г. колькасць жыхароў нашай краіны склала 9 млн. 750,2 тыс. чалавек. За 11 месяцаў мінулага года ў Беларусі нарадзілася 82,8 тыс. дзяцей, што на 1,2 тыс. болей, чым за аналагічны перыяд 2004 г. У студзені-лістападзе памерла 129,9 тыс. чалавек, што на 1,9 тыс. болей. Лічба памерлых у Мінску ў мінулым годзе павялічылася на 4%, у Берасцейскай вобл. — на 2,6%, Гомельскай — на 1,7%, Мінскай і Магілёўскай абл. — на 1,3%, Гродзенскай — на 0,2%. У Віцебскай вобласці дадзены паказчык знізіўся на 0,4%.

Па выніках мінулага года Мінстат краіны адзначыў павелічэнне колькасці смярцей ад інфекцыйных і паразітарных хваробаў (на 11,2%), хваробаў органаў дыхання (на 5,1), сістэмы кровазвароту (на 3,6). Пералічаныя захворванні сталі прычынай смерці 73,8% усіх памерлых за дадзены перыяд, з іх хваробы сістэмы кровазвароту — 55,8%. Лічба смяротных выпадкаў па прычынах, якія не звязаны з захворваннямі, павялічылася на 3,2%.

Міграцыйны прырост насельніцтва, паводле звестак Мінстата, за 11 месяцаў 2005 г. знізіўся і склаў 1 417 чалавек.

„Беларусы ў свеце”
ЗБС „Бацькаўшчына”, люты 2006 г.

Скасаваныя ільготы

Указам прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 80 ад 7.02.2006 г. зменены парадак паступлення ў вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь беларусаў замежжа.

Паводле прынятых правілаў, беларусы замежжа будуць паступаць у ВНУ і сярэдне-спецыяльныя ўстановы на тых жа ўмовах, што і грамадзяне Рэспублікі Беларусь — на конкурснай аснове. Такое ж права атрымалі і грамадзяне Расійскай Федэрацыі, Кіргізскай Рэспублікі, Рэспублікі Таджыкістан, Рэспублікі Казахстан. Пры паступленні беларусам замежжа трэба будзе прадстаўляць дакументы, што пацвярджаюць беларускую нацыянальнасць.

Калі правілы пачнуць дзейнічаць без змяненняў, то яны фактычна скасоўваюць існаваўшыя раней ільготы на атрыманне бясплатнай адукацыі (за кошт бюджэту). Нагадаем, што ў 1993 г. Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь была зацверджана Праграма „Беларусы ў свеце”, у адпаведнасці з якой дзяржава давала магчымасць беларусам замежжа атрымліваць адукацыю ў навучальных установах Рэспублікі Беларусь бясплатна і па-за конкурсам. Дакументам, які сведчыў пра беларускае паходжанне будучага абітурыента было хадайніцтва ад суполкі беларускай дыяспары.

МГА „ЗБС «Бацькаўшчына»”
„Беларусы ў свеце”, люты 2006 г.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

Зорка
для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 18 -

Грак сядзеў сумны ўсяноткі дзень. Нават тэлевізара не хацелася ўключаць. Палятаць па хаце таксама не было ахвоты. Хадзіў пешшу ад кухні да Гражынчынага пакоіка, звесіўшы дзюбу. Абрыдла сядзець на падаконніку — зусім нецікава назіраць як птушкі, кожны паасобку ці ў пары, носяць саломінкі ды валоссе сабе на вясенні рамонт гнёздаў, або збіраюцца ў неспакойныя чародкі. Найбольш гарлапанілі-сеймікавалі вароны, гракі ды галкі. Раптам уздымаліся чорнай хмарай у неба, кружылі над дрэвамі ды хатамі, абсядалі чорнымі цаткамі аголеныя яшчэ дрэвы.

— Чаго яны там? — каркнуў Грак да спадара Шадара, які прысеў за акном. — І цябе даўно я на падворку не бачыў!

— Не выпускалі мяне з хаты. Страшная справа, нават туалет мне паставілі ў сенях! Цьфу, хто гэта бачыў дома апаражняцца! Мне, вольнаму кату, закладваць лейцы! Яшчэ каб быў сабакам, дык тыя такі ўжо характар маюць, што скажаш, тое і зробяць, але... мне?! Палохаюць усіх птушыным грыпам. Ці ж палакомлюся на якую поскудзь?!

— Ушануй чужую смерць. Памерлы птах гэта табе ніякая не падла.

— Што нам, жывым, думаць пра такія справы! — Шадар плюнуў на лапу і стаў мыць пыску. — Галоўным чынам — трэба захоўваць гігіену. А ў цябе, Грак, няма дэпрэсіі? Як там твой апетыт? Кажуць, і несціся не хочацца?

— Ты пра што? — раскрычаўся Грак, затупатаў па падаконніку. — Якая дэпрэсія? Чый апетыт?! Ці я курка-нясушка, каб мне несціся хацелася ці не? Што ты тут мне ўнушаеш?

Грак у злосці аж дзеўбануў у шыбу.

— Скажу Гражынцы, што ты ходзіш самапасам! Хай пойдзе ды скажа тваім гаспадарам.

— Я ў іх толькі жыву, яны мне ніякае не панства, — зморшчыўся Шадар. — Схачу — пайду ў свет. Цьфу, якая абраза — на павадку хадзіць!

— Ты мне ўнушаеш, што я сваёй волі не маю?

— Дык вылеці на вуліцу.

Грак паглядзеў на пару варон, што сядзелі без справы на плоце. Жонка-варона была нейкая асалавелая. Муж неспакойна заглядаў ёй у дзюбу:

— Пакажы горла, скажы: кр-р-ра!

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Ніна Ваўранюк і Ліда Пякарская ў казачнай хатцы

Урок у казачнай хатцы

Бацькі і дзеткі, якія завіталі на адкрыты ўрок у ПШ н-р 4 у Беластоку, абавязкова наведалі беларускую хатку. Ужо ля ўваходa запрашалі іх да сябе вучаніцы Аліны Ваўранюк. Папраўдзе — у хатку патрапіў бы нават сляпы. З яе даляталі старыя падляшскія напевы. Ля парога, у чарзе, чакалі дзве маладыя пары з дзеткамі.

— Ой, паглядзіце! Казімеж Марцінкевіч! — здзіўляецца бацька. Сапраўды, на фотаздымках у галерэі бачым прэм'ер-міністра з навучэнцамі беларускай мовы. Сустрэліся яны ў час апошняй праваслаўнай Куцці. На стэндах бачым таксама фатаграфіі з летнікаў і экскурсій у Беларусь і Літву. Тут жа і дыпломы лаўрэатаў прадметных і мастацкіх конкурсаў. Вось і зараз у беластоцкай „чацвёрцы" трох лаўрэатаў прадметнага конкурсу па беларускай мове. Званне лаўрэата заваявалі Ганна Пякарская і Яраслаў Якацюк з шостага класа і Ніна Ваўранюк... з чацвёртага.

Памаленьку, зважаючы на каляровыя палавічкі, уваходзім у сярэдзіну. Па правым баку красуецца рад вышываных ручнікоў:

— Вышыванкі пазычылі мае бабулі з Коматаўцаў і Беластока, — кажа Матфей Сэвастыянік. Вышываныя ручнікі і макаткі прынесла Оля Каліна і Эмілька Мусько, усе вучні беластоцкай гімназіі н-р 7. Гэтая тройца найперш прыдумала ідэю пабудовы хаткі, а пасля разам з настаўніцай і бацькамі яе абсталёўвалі і аздобілі. Часам — да позніх гадзін.

На блакітнай сцяне вісяць ажурныя капы ў чырвоныя, блакітныя і фіялетавыя ружы. Насценную калекцыю, якую папаўняюць макаткі, прынесла ў хатку маці вучаніц — доктар Барбара Пякарская.

У святым кутку бачым ікону прыаздобленую вышываным ручніком. Ніжэй стаіць „госць" — кветка са збожжа, якую ставілі ў кожны калядны вечар. Госць меў запэўніць ураджай і багацце на працягу года. Тут жа бачым калядную зорку з саломы, якую вучні прыдбалі ў Мінску. Аднак найбольшую ўвагу прыцягвае высокі ложак з гафтаванымі падушкамі (дзеля эфекту скарысталі піяніна). Пад сцяной бачым лаву з жывымі рукадзельнікамі. Якраз у час адкрытага ўрока хлопцы і дзяўчаты сядзелі на лаве і займаліся вышыўкай.

У вочы наведвальнікаў абавязкова патрапіла плеценая калыска з „немаўляткам". Асабліва ў гэты бок ірваліся дзяўчынкі, якія жадалі хоць раз пагушкаць крыклівую малечу. А на печцы, аздобленай вянкамі апетычных каўбас — для старых і малых быў нарыхтаваны пачастунак: чорны хлеб з сальцам або са шмальчыкам. Для вегетарыянцаў — пірог з мёдам і кіслыя агурочкі.

— Мы хочам, каб наш сынок вывучаў беларускую мову, — кажуць Кацярына і Яраслаў Лісоўскія, якія разам са мной аглядаюць хатку. Хаткай захоплены дашкольнік Лукаш. Спадарства Лісоўскія будуць прывозіць сынка з Агароднічкаў што каля Супрасля.

— Мы таксама запішам свайго Паўліка на беларускую мову, — заяўляюць спадарства Анна і Роберт Савіцкія. Іх дашкольнік ад пачатку ходзіць у беларускі садок.

— А з верасня на яго месца пойдзе яго трохгадовы брацік. Пытаю Паўла, як яму ў хатцы.

— Як у казцы, — чую адказ.

Зорка

Вяртаемся да свайго

Адкрыты ўрок беларускай мовы для гімназістаў I „а” і I „б” класаў у Нарве наладзілі 19 студзеня г.г. Урок зноў правяла настаўніца Ніна Абрамюк. Раней такія заняткі адбыліся ў II класе ПШ, на ім пабывалі настаўнікі і бацькі дзетак. Тэма ўрока „Навагодняя ноч — вечар магіі, варажбы і розных гульняў”. Вучні, вядома, раней падрыхтаваліся да сустрэчы. Яны гутарылі з бацькамі, дзядамі, цікавіла іх асаблівасць і дзеянні ў Шчодры вечар. Вучні падзяліліся на тры групы. Першая група правяла інтэрв’ю са старажылкай, бабуля распавяла пра звычаі ў гэты вечар. На аснове сабранага матэрыялу вучні падрыхтавалі сцэнку — інтэрв’ю са старэйшым сужонствам пра навагоднія звычаі і абрады.

Другая група наладзіла сцэнку пра калядоўшчыкаў, якія хадзілі па хатах і спявалі шчодраўскія калядкі, пра розныя фокусы, якія вычварала моладзь у гэты вечар. Людзі ахвотна прымалі калядоўшчыкаў, частавалі іх булкамі, спецыяльна выпяканымі на багаты вечар. У пастаноўцы вучні карысталіся дыялектам, які выступае ў наваколлі Нарвы. На гэтай мове размаўляюць бацькі школьнікаў.

Фота Я. ІВАНЮК

Трэцяя група падрыхтавала багатае застолле з абрадавымі стравамі. Пры стале збіраліся паненкі з усёй вёскі. Яны жартавалі і частаваліся стравамі, а, перш за ўсё, варажылі пра будучыя замужжы. Гэтая група карысталася літаратурнай беларускай мовай.

Усе тры групы запрэзентаваліся знакаміта. Я глядзела на іх з радасным захапленнем. Мне падабаецца, калі моладзь вяртаецца да звычаяў і абрадаў сваіх продкаў. Думаю, што спадарыня Ніна Абрамюк умее найлепш паказаць такія традыцыі. Я веру, што дзякуючы такім заангажаваным настаўнікам і такім цудоўным вучням, старажытныя абрады будуць жыць у кожным наступным пакаленні.

Анна Рашкоўская — маці вучаніцы, якая прыняла ўдзел у адкрытым уроку

Тры Паўліны і Паўл

Паўл і Марцін не надта перажывалі адзінкі па хіміі, горш з дзяўчатамі. Паўліна Ш. раўла як сірэна:

— Вы не ведаеце што мяне сустрэне ў хаце?! — жаласна галасіла яна на ўсялякія суцяшэнні сяброў. — Вы нават не ўяўляеце...

— Які правал! Якая нязручнасць! — лямантавала ў сваю чаргу Іголка. Яна ўяўляла, што калі будзе ісці па вуліцы, наткнецца на выпадковы зброд, стане нявыгаднай сведкай і яе абавязкова застрэляць. Вядома, выпадкова.

Не дапамагалі суцяшэнні Дубалі, які спецыяльна з нагоды „хімічнай аварыі” ў класе адтэрмінаваў кантрольную. За ім пайшла Амелія Гурко, якая дазволіла вышываць на сваіх занятках кветкі-васількі. Але спакою ўжо не было ў класе. Калі чорны сцэнарый у выпадку Іголкі меў заключыцца бессэнсоўнай смерцю, тады ў выпадку Паўліны Ш. абазначаў нешта горшае... невядомае. Ды і сама яна падбівала катастрафічны настрой. У час кожнага чарговага перапынку Паўліна Ш. раўла як злоўлены ў сетку смаркаты бабёр. Пад канец дня стала яна раскідаць усе прадметы, якія апынуліся на яе дарозе.

— Вы не ведаеце што мяне сустрэне ў хаце?! — крычала яна ўсім па чарзе і загадвала сыходзіць ёй з дарогі, бо ў яе... сіндром дэфіцыту ўвагі і гіперактыўнасці, інакш АДГ.

— То падвядзем цябе пад самую хату, — ахвяраваліся сябры.

— Я сам усё раскажу бацькам, — першы абяцаўся Паўл, — раскажу як на споведзі...

Але Паўліна Ш. не хацела слухаць. Яна заявіла, што не баіцца фізічнага пакарання з боку бацькоўшчыны. Не баіцца іх аплявухі, увогуле не баіцца ніякай кары.

— Мая праблема намнога большая, — лямантавала ўсё галасней гімназістка, — намнога страшнейшая.

Пад канец працоўнага дня ўсё ж такі ўдалося выціснуць з Паўліны Ш. прычыну яе горкай роспачы. І гэта заслуга бойкай Амеліі Гурко, якая ўзяла гімназістку пад нож — спачатку аблаяла, а пасля суцяшыла:

— Бо мама сказала, што калі атрымаю адзінку, — выдушыла праз слёзы Паўліна Ш., — яна перастане хадзіць са мною па магазінах за пакупкамі. А сёння мы мелі схадзіць у адно месца і купіць мне зялёную ільняную спадніцу. Такую „хіпі”. Божа! Усё прапала! Я хіба павешуся!

У класе запанавала доўгае маўчанне, пасля многія сталі смяяцца. Хоць не ўсе — многія дзяўчаты ківалі Паўліне Ш. галовамі ў знак зразумення.

Толькі Амелія Гурко схапілася аберуч за галаву і іранічна насупілася. Першы раз у жыцці ёй хацелася выгукнуць на ўсе грудзі: „Але ж гніце!”

(працяг будзе)

Арабінка

Хлопцы баяцца трэмы

— А чаму сярод вас так мала хлопцаў?

— Бо ў хлопцаў большая трэма, яны надта хвалюцца, — чую ў адказ.

Еву і Юстыну сустракаю ў Нарве на школьным дэкламатарскім конкурсе „Роднае слова”.

Сапраўды, сярод гімназістаў рэдка трапляюцца хлопцы, кампанія тут выключна дзявочая.

Ева Анапюк, родам з Ласінкі, дэкламуе ўжо з трэцяга класа. Сёння яна падрыхтавала „Дзіва” Вінцука Адважнага. Верш, які падабрала ёй настаўніца, спадабаўся ўсім:

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Ева Анапюк (справа) і Юстына Банькоўская

— Мой верш жартоўны, — кажа Ева, — а я люблю такія.

Юстына Банькоўская падрыхтавала больш сур’ёзны твор — „Казку пра мову” Міколы Маляўкі. Яна таксама выступае ўжо трэці год. Сяброўкі не хваляваліся, мабыць, таму, што выступаюць яны ў беларускіх спектаклях, якія ладзіць настаўніца Ніна Абрамюк.

Зорка

Польска-беларуская крыжаванка № 13

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут рызыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 9: Малако, эсэ, мозг, сказ, шарж, на, калы, рад, галінка, храпа, Осла, рачулка. Мама, ах, змагар, лапа, шыла, сані, экран, кок, бэз, раса, на, квадрат.

Узнагароды, **ільняныя экалагічныя сумкі**, выйгралі: **Сара Галубоўская, Паўліна Зюзя** з Нараўкі, **Паўліна Лук’янюк, Ася Іванюк** з Нарвы, **Агата Антанюк, Мартына Сакалоўская, Кася Тарасюк** з Дубін. Віншуем!



Вельмі цяжка засвоіць увесь матэрыял па беларускай літаратуры і мове на аднолькавым высокім узроўні, — кажа настаўнік беларускай мовы Гайнаўскага белліцэя Ян Карчэўскі, які шмат гадоў паспяхова рыхтуе вучняў да алімпіяды...

Пад бел-чырвона-белым сцягам

— Вучні ў час вусных адказаў прэзентавалі высокі ўзровень ведаў і патрапілі добра пераказваць свае думкі на літаратурнай беларускай мове. Заяўлялі яны аб прывязанасці да сваёй сям'і, школы і малой айчыны. Калі перад камісіяй гаварылі шчырую праўду, то яны на добрай дарозе ў свядомыя беларусы, — заявіў прафесар Аляксандр Баршчэўскі, старшыня камісіі Цэнтральных элімінацый XII выпуску Алімпіяды беларускай мовы, якія 9 сакавіка адбыліся ў Агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім. Спаборніцтвы вучняў праходзілі ў спартыўнай зале пад бел-чырвона-белым сцягам, які вісеў побач сцягаў Польшчы і Еўрасаюза.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У гэтым годзе алімпіяда праходзіла пад бел-чырвона-белым сцягам, побач якога віселі сцягі Еўрасаюза і Польшчы. Вусныя адказы адбываліся перад трыма камісіямі (злева: Аляксандр Баршчэўскі і Баляслаў Хмялінскі)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

— А як жа інакш, святкуем у нашай сям'і Вялікдзень і Куццю, — заявіла Альжбета Пліс камісіі (злева: Мікола Хаўстовіч, Марк Гаўрылюк і Васіль Сакоўскі)

Не трэба саромецца беларускасці

Белліцэісткі, з якімі я ўступіў у размову пасля вусных выказванняў, захапілі мяне гутаркай пра нацыянальную свядомасць. Усе мае субяседніцы лічаць сябе беларускамі і рашыліся выказацца аб школьных сябрах, якія прытрымліваюцца польскай нацыянальнасці.

— Можа некаторыя нашы сябры на пытанне пра іх нацыянальнасць кажуць, што яны палякі, бо не хочуць адрозніваццца ад іншых. Іншыя могуць думаць, што палякі — лепшы народ і саромяцца сваёй беларускасці, — кажуць Таіса Засім з Семенякоўшчыны, Альжбета Пліс з Выгоды і Іаанна Дунай з Гайнаўкі.

— На фарміраванне нацыянальнай свядомасці вельмі вялікае ўздзеянне мае выхаванне ў сям'і і падыход да гэтых спраў бацькоў. Уздзеянне школы таксама важнае. Больш ліцэістаў лічыла б сябе беларусамі, калі б у школе больш прадметаў выкладалася па-беларуску. І наадварот, калі б у нашай школе не было беларускай мовы, яшчэ менш вучняў прызнавалася б да беларускасці, — гаворыць Ірына Станкевіч з Бельскага белліцэя. — Я лічу, што не трэба саромецца сваёй беларускасці.

— Важна, што ад самых маладых гадоў я ў сям'і гавару на беларускай гаворцы, — дабаўляе Таіса Засім. Яе сяброўкі заяўляюць, што гавораць на дыялектнай беларускай мове са сваімі бабулямі.

— На ўсталяванне беларускай свядомасці мае таксама ўздзеянне Беларуская алімпіяда. Рыхтуючыся да яе, мы чытаем беларускія творы і з вучнямі размаўляем пра іх з пашанай. Зараз, пасля алімпіяды, мы беларускую літаратуру ведаем лепш, чым польскую, — гаворыць Паўліна Васілюк з Гайнаўскага белліцэя.

Цікавыя тэмы

27 белліцэістаў, якія дайшлі да апошняга этапу алімпіяды, распачалі спаборніцтва за званне лаўрэата па пісьмовых працах на адну з чатырох прапанаваных тэм. Так, як і ў час раённых элімінацый, вучням прапанавалася паказаць умеласці і веды па творчасці Максіма Багдановіча. Ліцэісты, якія любяць філасофскія разважанні, маглі выказвацца наконт сэнсу ўласнага жыцця.

— Тэмы для пісьмовых прац былі цікавымі, хаця трэба было звяртаць увагу на закавычкі. Каб пішучы працы іх пазбегнуць, трэба было ўвесь час трымацца тэмы працы, — кажа Ірына Станкевіч. — Я выбрала тэму пра адлюстраванне асабістай трагедыі Максіма Багдановіча ў яго паэзіі, бо ведала, што магу цікава напісаць пра гэта. Я з пашанай пісала пра тое, што Багдановіч зрабіў у сваім кароткім жыцці. Ён мужна змагаўся са сваімі трагедыямі і такіх людзей трэба цаніць.

— Я рашыўся пісаць пра разуменне Максімам Багдановічам ролі мастацтва ў жыцці чалавека і народа. У сваёй рабоце мог я выкарыстаць многа твораў аўтара, які пісаў пра мастацтва, — гаворыць Лукаш Верамеюк з бельскай школы. — Я думаю, што ўсе пісьмовыя тэмы не былі цяжкімі, толькі трэба было задумацца і выбраць такую, каб пасля не пісаць у пустое.

У пісьмовых практыкаваннях па граматыцы трэба было напісаць злучна або раздзельна „не" з рознымі часцінамі мовы і выканаць задачы на дзеясловах і лічэбніках.

— З практыкаваннямі па граматыцы горш атрымалася, — заяўляе Таіса Засім.

— Пераклад тэксту з польскай мовы на беларускую не быў вельмі складаным, але не ведаў я, як перакласці некаторыя словы бытавога характару, — кажа Адрыян Федарук з Бельскага белліцэя.

Аб літаратуры і сваёй малой айчыне

У час вусных выказванняў белліцэісты расказвалі пра беларускую літаратуру перыяду ад Вялікага княства Літоўскага ажно да сучаснасці. У многіх пытаннях закраналіся разнародныя справы, датычныя жыцця на Беласточчыне. Таксама трапляліся білеты з пытаннямі аб творчасці Максіма Багдановіча.

— У час вуснага выказвання я расказвала перад камісіяй пра святкаванне Вялікадня і Куццю ў маёй сям'і, — кажа Альжбета Пліс. Яе сяброўка расказвала пра святкаванне Нараджэння Хрыстовага.

Мае субяседніцы кажуць, што многа часу рыхтаваліся да алімпіяды. Паўтаралі веды што здабылі ў час вучобы ў ліцэі. Бралі творы беларускай літаратуры са школьнай бібліятэкі і чыталі іх дома, карысталіся падручнікамі і іншымі дапаможнікамі па літаратуры.

— Зразумела, мы чыталі многа твораў Максіма Багдановіча, бо ведалі, што ў сёлетняй алімпіядзе яго творчасць будзе вядучай тэмай, — заяўляюць Таіса Засім і Паўліна Васілюк. — Аднак, у агульным, трэба было рыхтавацца да вусных адказаў па ўсёй беларускай літаратуры.

Добра падрыхтаваліся

Былы настаўнік беларускай мовы Гайнаўскага белліцэя Васіль Сакоўскі, які старшынстваваў адной з камісій па вусных адказах, станоўча ацаніў выказванні ўдзельнікаў алімпіяды.

— Вучні, якія прыступілі да цэнтральных элімінацый былі лепш падрыхтаваныя, чым на раённым этапе. Можа зараз было ў іх больш часу для падрыхтоўкі, бо слабых адказаў увогуле не было. У разважаннях аб мясцовых справах ліцэісты добра арыентаваліся. Можа ў літаратурных справах іх веды не заўсёды былі дакладнымі. Аднак радуе нас, што моладзь жыве нашымі справамі, — кажа Васіль Сакоўскі.

— Атмасфера ў час майго вуснага адказу перад камісіяй была вельмі добрай, — заяўляе Марта Філіповіч з Гайнаўкі. — Калі члены камісіі бачаць, што вучань мае веды, але не патрапіць іх пераказаць, ставяць дадатковыя пытанні.

Формула Алімпіяды беларускай мовы ў асноўным не мяняецца і ліцэісты ўжо з першых класаў могуць пачынаць рыхтавацца да спаборніцтваў па беларускай літаратуры і мове.

— Вучні, якія хочуць прыступаць да алімпіяды, мусяць трымацца распрацаваных арганізатарамі правілаў. Перамога ў алімпіядзе залежыць у галоўным ад ведаў, але аб многім вырашае жараб'ёўка пытанняў для вусных адказаў. Асоба можа выцягнуць білет з тэмай, якая дазволіць ёй умела паказаць веды і красамоўны талент. Можа таксама папасці тэма, да якой вучань будзе слабей падрыхтаваны і тады будзе ён ацэнены ніжэй. Вельмі цяжка засвоіць увесь матэрыял па беларускай літаратуры і мове на аднолькавым высокім узроўні, — кажа настаўнік беларускай мовы Гайнаўскага белліцэя Ян Карчэўскі, які шмат гадоў паспяхова рыхтуе вучняў да алімпіяды.

У гэтым годзе званне лаўрэата заваявалі 8 вучняў, а ўсе апошнія ўдзельнікі цэнтральных элімінацый сталі фіналістамі. Першыя раўнапраўныя месцы здабылі Юстына Тарасюк і Кацярына Жменька з Бельскага белліцэя. Другія месцы з аднолькавай колькасцю балаў занялі Марта Федарук, Ірына Станкевіч, Лукаш Верамеюк, Эвеліна Вышкоўская з бельскай школы і Аляксандра Варановіч з Гайнаўскага белліцэя. На трэцім месцы апынулася Агата Васільчык з гайнаўскай школы.

Аляксей Мароз

У 2002 годзе Люся перажыла 11 аперацый. Цяпер Войтэк гадуе дачушку, а сястра Люсі збірае шасцігадовай Ізе маміну спадчыну; хоча даць ёй, калі падрасце, калі зразумее. Лісты, вершы, пра любоў, прамінанне, прыроду. Мінае жыццё маладое...

Люся Анхім: словы сэрцу дарагія

— Паехалі мы на Калясное. Там хата ёсць. Мусіць хтосьці каля гэтага хадзіць. І тады я знайшла лісты. Хоць мы былі тры сёстры, ні адна ніколі ў рэчах другое нічога не шукала. Знайшла сшыткі з вершамі. Знайшла лісты Люсі да Веры Валкавыцкае, — расказвае Ірэна Яканюк, сястра Люсі Анхім. Яна і прыслала сумную вестку пра маладую паэтэсу, спакутаваную хваробай. Люся памерла 3 сакавіка 2004 г., дзевятнаццаць гадоў ад свайго дэбюту на літаратурнай старонцы „Белавежы". Людміла Анхім была тады вучаніцай бельскага белліцэя. Перанеслася з эканамічнага ліцэя ў беларускі, пісала ў „Ніву", ліставала з рэдактаркай Верай Валкавыцкай, з Львом Стагановічам з Амерыкі. Пасля атэстату сталасці пайшла на беларускую філалогію. На практыку ў Мінск паехала ўжо з перасаджанымі ныркай і падстраўнікавай залозай. Добра тады сябе адчувала, вярнулася радасная, паздаравеўшая. На жаль, арганізм адкінуў перасаджаны орган ад здаровага хлопца, які загінуў у аўтакатастрофе. Нырка працавала, пасля падтрымліваная дыялізамі. Люся стала слепнуць. Страціла адно вока, другое аперыравалі ёй у Парыжы. Не магла хадзіць. Пагоршылася ёй пасля таго, як нарадзіла дачку Ізу Таццяну. Дачушку Люся ўбачыла праз два гады. Ледзь было распазнаць былую жыццярадасную, ружавашчокую мілавідную дзяўчыну ў спакутаванай, худой жанчыне з палачкай, у шыкоўным строі на яе царкоўным шлюбе ў варшаўскай царкве на Волі. З Войткам Савонем, католікам, пазнаёмілася была на аўтобусным прыпынку. Завялі размову, аказалася, што гэта яны сябе шукалі ўсё жыццё. Войткава фірма „Кастарама" пасля фундавала лячэнне Люсі ў Францыі. У 2002 годзе Люся перажыла 11 аперацый. Цяпер Войтэк гадуе дачушку, а сястра Люсі збірае шасцігадовай Ізе маміну спадчыну; хоча даць ёй, калі падрасце, калі зразумее. Лісты, вершы, пра любоў, прамінанне, прыроду. *Мінае жыццё маладое...* — цяпер гэтыя тэксты перачытваюцца іначай. *Сонца свеціць над душой маёю, сонца свеціць над маёю хатай...* „Была вясна, прайшло і лета..." „Словы сэрцу дарагія". *У чым я завініла, што Ён мяне так пакараў? У чым я завініла, што Ён мне такую дарогу даў?*

Люся з сёстрамі Гражынай і Ірэнай ды маленькім Міркам

— Мама, няма хворых людзей, — тлумачыла Люся сваёй маме. Была свядомая свае хваробы. Адыходзіла ў бальніцу, а сябры і сям'я мелі пачуццё, што не вернецца. А яна вярталася, прыязджала ў Калясное, з калегамі хадзілі па вёсках, збіралі народны матэрыял, ехала ў Гайнаўку, памагала сястры ў краме. Не давалася хваробе, якая цікавала за ёю з маленства. Ад самога пачатку сваім сілом хацела здушыць таленавіты і добры парастак. Ірэна, старэйшая ад яе на дзесяць гадоў, а ад другое сястры на восем, займалася сястрычкамі і памятае, як трохмесячную сінеючую ўжо малечу павезла скорая ў Беласток; лекар з Юшкавага Груда прыпісаў быў немаўляці лякарства ў дозе, якую давалі дарослым падзеленай на чатыры часткі. „Памрэ нам у дарозе — вернемся!" — сказаў лекар. Уратавалі. Вярнулася. Расла добра, адно толькі што мучыў яе вечны голад. Мабыць, запозна адкрылі ў яе цукровую хваробу, лячылі спачатку неадпаведнымі дозамі інсуліну. Ужо ў ліцэі пачаліся ўскладненні.

Люсіна сястра Ірэна сядзіць на падлозе свайго гайнаўскага дома, пераглядае сшыткі і аддзельныя лісткі з таго, што напісала сястра, што прывезла з роднае хаты ў Калясным, маленькай вёсцы сярод лесу ў Міхалоўскай гміне. Памяткі, мемуарныя запіскі ад Люсіных калег са школы ў Адрынках ды Новай Волі. Вершы пра каханне, пра родную мову, пра той цудоўны лес, што акаляў хату. Свежая рана душы. Слёзы. *Ідуць шэрыя, хмурныя дні. Сэрца ападае, як лісточкі з дрэў. Назбірала іх многа, а сэрца адно. Ідзе дождж, ідзе дождж вялікі, вялікі. Разлівае лужыны на дарогах... Пройдуць шэрыя дні, пройдуць дажджы, а сэрца, яно адно астанецца.*

Міра Лукша

Люся Анхім

Астанься

Не кідай ты кутка
дзе нарадзілася
Не кідай ты кутка
дзе мова твая
Не кідай ты кутка
дзе маці, бацька ёсць
Не кідай ты кутка
дзе дзед і бабуля твая
Не кідай ні палёў, ні лугоў
ні спеву жаваранкаў
Астанься з імі сёння
Астанься з імі заўтра
Астанься з імі назаўсёды
Табе і ім лягчэй жыць будзе
сягоння
заўтра
назаўсёды

Калі пытаюць

Калі пытаюць
Куды ты ідзеш? —
Адказвай:
У школу.
Калі пытаюць:
У якую? —
Адказвай:
У Беларускую.
Калі пытаюць:
Ці добра там? —
Адказвай:
Як у роднай маці.

Уладзімір Саўчук

Новыя вершы

Місія

Краю мой родны
краю мілы
змагацца сам
не маю сілы
цяжка так жыць
і быць паэтам
ды знаю што
памру за гэта

Ніхто нам
не памог падняцца
усе застрашаны
— баяцца,
у якой зямлі
рассеем зерне —
такім і хлебам
час паверне.

Бацькаўшчына

Лёс адабраў вязь пакаленняў
падзяліў шмат людзей,
паноў не стала,
ды Радзіма жыве.

Куды ляціш, белая лебедзь? —
вырай крычыць: — Беларусь, Беларусь,
там цішыня людзей яднае
за чысціню сваю — клянуся,

світанак чысты як сляза
зрокам агорне спакойны блакіт,
загляне, а Нёман дзявочы і ціхі
нейзаж гэты доўна спіць

на душы.

* * *

Ніхто мяне не шкадаваў
не абціраў дзіцячых слёз
каму ў дарозе падказаў
што кропля шчасця гэта лёс

хто ў жыццё накіраваў
стварaў дыялог бягучых спраў
усім падзякаваць хачу
каму так моцна дакучаў

ой цяжка цяжка будаваў
гады любові і дабра
аднак цяпер душа баліць
за свайго роднага сябра

і не прыдумаю чагось
чаго ў жыцці б пакаштаваў
забаўкі шчасця ўжо няма
якую часта прытуляў

Жыццё вядзе мяне на шлях
маўклівых споўненых гадоў
і бачу поўнасцю сябе
ізноў я тут — ізноў ізноў.

* * *

Вечар ціхне
ажывіўся ліхтарык
на сцяне Багародзіца Маці
зрокам цісне хваробу
цяжкі пот пераліўся сілком
па спіне працягае бічамі
у вачах маіх топіцца мгла
ды з усіх сіл маўчу

першы жальнік акрыла пакута
а астатні малітва ў Бога
— хто так шчыра мяне пакахае
апроч цябе, мая ты кароста,

ой як хочацца жыць.....!
за сцяною спеў, гоман слоў
адчуваю сябе такім спакойным
як дзіцятка на іконе сноў.

Беларускае сеціва стракаціць сайтамі, праз якія ідзе асвятленне выбарчай кампаніі...

www.belnews.info

Калі гэты нумар „Нівы" пабачыць свет, галасаванне ў Беларусі, прызначанае на 19 сакавіка, ужо пройдзе. Больш таго, стануць вядомыя вынікі і рэакцыя на іх як унутры краіны, так і за яе межамі. Нягледзячы на тое, што гучаць песімістычныя прагнозы адносна перамогі дэмакратычных кандыдатаў, нягледзячы на ўзмацненне рэпрэсій на актыўных дзеячаў апазіцыі, цяпер можна з упэўненасцю сказаць адно — выбары 2006 года яскрава адрозніваюцца ад выбараў 2001 года. Гэта відаць як па настроях грамадства, так і па праявах антыўрадавай актыўнасці, у першую чаргу ў Інтэрнэце. Беларускае сеціва стракаціць сайтамі, праз якія ідзе асвятленне выбарчай кампаніі. Цікава, што нядаўна створаныя віртуальныя старонкі не толькі дублююць паведамленні агульнавядомых беларускіх Інтэрнэт-рэсурсаў, выконваючы ролю падстрахоўшчыка ў данясенні інфармацыі, але і распавядаюць аб мясцовых падзеях, звязаных з выбарчай кампаніяй.

Адным з падобных сайтаў, створаных выключна дзеля асвятлення працэсу выбараў ёсць „Выбары ў Беларусі.info". Месціцца ён па адрасе: www.belnews.info і выглядае даволі няблага, калі зважаць, што жыццё данага сайта наўрад ці прадугледжана доўгім. На першы погляд выяўленне не надта кідкае. На светла-салатавым фоне нібыта аркуш паперы з паведамленнямі. Але адразу заўважаецца незвычайная пабудова. Навінныя паведамленні месцяцца з левага боку і займаюць большую частку падзеленай на няроўныя па памерах калонкі. З правага боку — выйсці да рубрык сайта, каляндар, спасылкі і іншыя дадатковыя віртуальныя аздабленні.

Навіны на галоўнай старонцы распавядаюць аб самых апошніх падзеях, прычым падзелены яны на беларускія і віцебскія. З гэтага трэба разумець, што ідэя стварэння сайта мае віцебскую прапіску. Але каб даведацца, што менавіта рухала стваральнікамі „Выбараў у Беларусі.info", трэба клікнуць на выйсце да рубрыкі „Агульнае", якая знаходзіцца з правага боку выяўлення. „Гэты сайт прызначаны для стварэння штодзённага дайджэсту найважнейшых навінаў выбараў прэзідэнта Беларусі, — тлумачаць ананімныя натхняльнікі сайта. — Не сакрэт, што не ўсе маюць магчымасць карыстацца Інтэрнэтам, а па-за межамі Інтэрнэта свабоднай інфармацыі ў Беларусі практычна не існуе. Таму мы стварылі гэты праект, дзе кожны дзень будуць змяшчацца самыя важныя навіны Беларусі ў фармаце зручным для раздрукоўкі. Кожны зможа самастойна спампаваць такі файл, раздрукаваць яго і раздаць знаёмым і сябрам. Толькі так мы зможам прарваць інфармацыйную блакаду".

Згадзіцеся, мэта высакародная па цяперашніх беларускіх рэаліях, калі незалежная прэса калі не памерла зусім, дык ледзьве дыхае.

Падзел на беларускія выбарчыя навіны і паведамленні з віцебскага рэгіёна бачны і ў падрубрыках. „Навіны выбараў. Беларусь" і „Навіны выбараў. Віцебск" змяшчае адсартаваную падборку інфармацыі, таму карыстальніку няцяжка будзе пры неабходнасці знайсці тое ці іншае паведамленне адпаведна яго маштабу. Таксама падаецца магчымасць паглядзець навіны за кожны дзень выбарчай кампаніі, пачынаючы ад шостага сакавіка.

Размешчаныя ніжэй спасылкі дазваляюць выйсці не толькі да навінных сайтаў, але і да прэзентацыі ў Інтэрнэце кандыдатаў у беларускія прэзідэнты Аляксандра Мілінкевіча і Аляксандра Казуліна.

Уладзімір Лапцэвіч

У агульным заліку наша дружына апынулася куды вышэй здаровых айчынных прадстаўнікоў, трапіўшы ў дзесятку лепшых краін...

Беларусь, беларусы...



Срэбны дождж

Беларускія параалімпійцы на турынскай алімпіядзе прадэманстравалі сілу нязломнага духу і мажлівасці сваіх шматпакутных целаў. Няпоўнаспраўныя спартоўцы — людзі асаблівыя. Некаторыя з іх сур'ёзна займаліся вялікім спортам, а потым, зрабіўшыся ахвярамі жорсткага лёсу, змушаны былі перакваліфікавацца. Іншыя, інваліды ад нараджэння ці стаўшыя імі ў выніку выпадкаў, шукалі жаданне да жыцця праз спорт. І гэтая прага да духоўна паўнавартаснага жыцця зрабіла іх волатамі.

Для агульнай інфармацыі заўважым, што інваліды ў Беларусі складаюць ажно 7 адсоткаў ад агульнай колькасці насельніцтва. Так што такіх людзей даволі шмат. Адважная васьмёрка, якая рэпрэзентавала Беларусь у Італіі, выявіла сапраўдную волю да перамогі. Найбольш перапала нашым прадстаўнікам срэбнага металу. Першай вызначылася ў Турыне **Людміла Ваўчок**. Яна стала другой на лыжнай дыстанцыі два з паловай кіламетра. У той жа дзень дасведчаны **Сяргей Сільчанка** на дыстанцыі 5 кіламетраў таксама заваяваў срэбра. Пераможцу, амерыканскаму параалімпійцу ён саступіў толькі чатыры секунды. Не абышлося і без сур'ёзных хваляванняў. Лідэрка беларускай дружыны гродзенка **Ядвіга Скарабагатая** ва ўмовах кісароднага галадання некалькі разоў падала на 5-кіламетровай дыстанцыі ў парнай гонцы інвалідаў па зроку, а пасля фінішу зусім страціла прытомнасць. Якое ж было агульнае здзіўленне, калі праз пару дзён самая тытулаваная айчынная параалімпійка не толькі выйшла на старт, але і разам са сваім вядучым **Васілём Гаўруковічам** заваявала бронзавы медаль на лыжнай дыстанцыі 10 км. Цікава, што гродзенка Скарабагатая спецыялізуецца не толькі на лыжных гонках. У чэмпіёнкі папярэдніх зімовых параалімпійскіх гульняў у актыве таксама бронза аналагічных летніх спаборніцтваў 1996 года ў лёгкай атлетыцы.

У іншай катэгорыі на пяці кіламетрах свой другі срэбны медаль узяла Людміла Ваўчок. Калісьці Людміла лічылася перспектыўнай лёгкаатлеткай, але пасля ў яе біяграфіі здарылася трагічнае падзенне з даху высокага дому. Цяпер дваццаціпяцігадовая Ваўчок дасягнула найлепшых паказчыкаў у сваіх выступах.

А ў мужчын беларускі дуэт **Васіль Шаптабой** і **Мікалай Шаблоўскі** пасля дзесяцікіламетровай гонкі таксама ўзышоў на другую прыступку п'едэстала. Прадстаўнік горада Маладзечна Шаптабой, дарэчы, выступаў на афінскай летняй алімпіядзе, дасягнуўшы там чэмпіёнскага тытула ў гонках на велатандэме. Яшчэ адно срэбра беларусы заваявалі ў прэстыжнай эстафеце.

У агульным заліку наша дружына апынулася куды вышэй здаровых айчынных прадстаўнікоў, трапіўшы ў дзесятку лепшых краін. Значная заслуга ў поспехах беларускіх няпоўнаспраўных спартоўцаў належыць старшыні нацыянальнага Параалімпійскага камітэта Алегу Шэпелю. Гэты легендарны чалавек у свой час пяць разоў дасягаў чэмпіёнскіх тытулаў на параалімпіядах, а зараз выяўляе выдатныя менеджэрскія якасці.

Уладзімір Хільмановіч

Вільня, 16 сакавіка 2006 г.

Мінск, 19 сакавіка 2006 г.

Сакавіцкія віншаваньні

Дарагія суайчыньнікі!

Таварыства беларускай культуры ў Літве віншуе Вас і Вашых аднадумцаў з найвялікшым нашым Сьвятам — Днём волі, цяпер забароненым існуючым рэжымам на нашай Бацькаўшчыне Беларусі.

Цьвёрда верым у канчатковую перамогу здаровых патрыятычных сіл Беларусі і сваёй працай будзем спрыяць гэтаму.

Жыве Беларусь!

Старшыня Хведар Нюнька
сакавік 2006 год

Зялёныя лёгкія Яцэвіч і Гусакоў

Некаторыя нашы вёскі схаваны ў своеасаблівай глыбінцы, здалёк ад важнейшых дарог. Вось такой нашай вёскай „з краю” з'яўляюцца Яцэвічы, куды знарок не звабіць ніякая дарога. Не помню ўжо ў якой мясцовасці адна гаспадыня сказала, што яна з Яцэвіч і я пацікавіўся гэтай вёскай.

— Ат, — адказала мне, — п'юць...

Нагода наведаць Яцэвічы трапілася мне даволі неардынарна. Паехаў я ў Гусакі, бо ж, думаю, цяпер птушыны грып і пра такую з'яву найлепш было б пагаварыць у мясцовасці, якая мае хаця намінальнае дачыненне з птушкамі.

Ужо на аўтобусным прыпынку з кустоў прывітаў мяне шчэбет птушынай драбязы. На першым панадворку, пасярэдзіне, на марозе тулілася да сябе некалькі курэй. На вуліцу сталі выходзіць небудзённа апранутыя вяскоўцы, усёй вёскай ішлі праводзіць пакойніка. Значыць, прыйдзецца мне пацікавіцца іншай вёскай.

Ад Гусакоў да мастка дарога ўтаптаная дамашняй жывёлай; пад мастком вадапой. І там адрэзак рэчкі, мо ў сотню метраў, не скаваны марозам. Па вадзе плаваюць качкі. А каровы тую ваду п'юць непераваранную...

Направа ад дарогі з Гусакоў у Плютычы шпарка расце абшырная маладая пасадка: палоскі хваіны наперамен з палоскамі бярэзіны; хвойкі вышынёю ў пяць гадавых прыростаў. Налева ад дарогі сасновы самасей такога ж узросту. У вочы кідаецца кантраст: пасадка нагадвае сціснуты строй пехацінцаўчырвонаармейцаў на Чырвонай плошчы, а самасеі — пузатых буржуяў з савецкіх карыкатур. У адным месцы мітусня звярыных слядоў з крывавай плямай пасярэдзіне; мабыць нейкі зайчык трапіў у капкан больш клыкатых дзялкоў. Калі нашы палі саступяць лесу, не

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

будзе куды і зайчыкам дзецца, хіба што следам за людзьмі ў гарады — у заапаркі.

На дарозе ў Яцэвічы след саней і конскіх капытоў. Яцэвічы з боку Плютыч вітаюць відам вялікіх клуняў, якія калісь паставілі вялікія гаспадары. Але вуліца ў вёсцы вузенькая, быццам не кулакі тут жылі, але беднякі. На крайнім панадворку бабулька, падпіраючыся кіёчкам, дужаецца з ахапкам лёгкіх сасновых паленак, пакладзеных у фартух. Рэкамендуе мне шукаць размоўцаў далей на вёсцы.

— А калі там іх не знайду, — пытаю, — то ці можна будзе вярнуцца да вас?

— Ай, не, бо я зараз пайду даць грошы, каб хто лякарства са Страблі прывёз, — адбіваецца ад нечаканага госця.

Каля паловы нямногіх хат адсутнічаюць сляды. Заходжу на адзін з панадворкаў, дзе тройка мужчын парадкуе толькі што прывезеныя на санях сасонкі, ссечаныя ўвосень каб даць больш прасторы дужэйшым дрэвам.

Да вайны вакол Яцэвіч не было хваіны, толькі крыху альшыны. Цяпер лес падступае пад самую вёску. Кідаюцца ў вочы мураваныя будынкі, гэта вынік пажару, які спасціг Яцэвічы ў 1964 годзе; згарэла тады шмат гаспадарскіх будынкаў, хаты ўцалелі. Ну і людзі сталі адбудоўваць свае будынкі з негаручых матэрыялаў. Прывозілі цэглу з Каплян, наймалі майстроў з Беластока, а пасля і самі сталі мураваць. Не ўсе будынкі, пастаўленыя такімі самавукамі, прайшлі выпрабаванне часу.

У Яцэвічах яшчэ асталося каля трыццаці душ. Наймалодшаму аўтахтону шэсцьдзесят гадоў, ягонай жонцы на пяць менш. Ужо больш трыццаці гадоў у вёсцы не нарадзілася ніводнае дзіця. Калісь у Яцэвічах было трыццаць пяць коней, сёння іх яшчэ чатыры. І тры трактары. І адна карова-сіротка. Ніводнай легкавушкі. Некалькі веласіпедаў. На адным з панадворкаў чародка гусей; калісь іх трымалі ўсе, на пер'е, падушкі. Каля вёскі некалькі фольгавых буданоў, дзе сяляне вырошчвалі сабе гародніну.

Мабільная крама наведвае вёску штодзённа. У мінулым годзе ў Яцэвічы быў пракладзены водапровод. Тэлефоны маюць усе ахвотныя. Бо калі трэба да лекара, тады пажылыя вяскоўцы клічуць з гарадоў сваіх дзяцей, якія вязуць іх у Беласток або Бельск. А можна пазваніць і ў Страблю, прыедзе машына, і лекі прывязе. А ў Страблі аптэкі няма, але тамашнія медыкі бяруць на камісію з аптэкі ў Вышках найбольш папулярныя лякарствы і на месцы прадаюць іх патрабуючым; такім лячэннем карыстаецца, відаць, і мая першая субяседніца.

З Яцэвіч выходзяць дарогі ва ўсе суседнія вёскі: у Страблю, у Мулявічы, на чыгуначную станцыю ў Страблі. Але крыжы стаяць толькі пры адной дарозе, што вядзе ў Гусакі, у Плютычы і ў прыхадскі Райск. Яшчэ да вясковых будынкаў прымыкае бетонны крыж пастаўлены 23 мая 1914 года, абведзены металічнай агароджай у сакавіку 1990 года; цікава, колькі душ дачакае яго стогадовага юбілею. І далей за вёскай стаіць, высокі яшчэ, драўляны крыж, пра якога пачаткі не помняць нават найстарэйшыя жыхары Яцэвіч. Нейкі час таму знялі яго з перагніўшага камля і ўкапалі нанава. Ён яшчэ можа стаяць дзесяцігоддзямі; невядома толькі, ці падгляднай яму вёсцы будзе пад сілу выстаяць з ім.

Аляксандр Вярбіцкі

Свой погляд

„Што дала нам палітыка?” — пад такім загалоўкам друкаваўся допіс Міхася Куптэля ў 11 нумары „Нівы” ад 12 сакавіка 2006 года. На маю думку, аўтар не без прычыны кранае тры важныя праблемы: вобраз сучаснай рэчаіснасці ў РБ, месца беларускай меншасці ў Польшчы ды адносіны ўлады да тыднёвіка на прыкладзе стаўлення чыноўнікаў пасля кантролю НКП і крымінальнай справы супраць Праграмнай рады „Нівы”.

У першай справе скажу такое: у кожнага свой погляд на сучасную рэчаіснасць у РБ. У мяне таксама. З адным трэба пагадзіцца: балючай застаецца справа роднай мовы. Нідзе такога няма. У крамах, дзяржаўных установах, штодзённым жыцці селяніна на вёсцы, нават у канторах Раённага выканаўчага камітэта ў Камянцы размаўляюць па-руску. Мне здаецца, што гэта вынік шматгадовага панавання Расійскай імперыі.

Мне апошнім часам часта прыходзілася пабываць на Брэстчыне. Тое, што прыкмячаў я ў шасцідзесятых гадах, наведваўшы дзядзьку ў Апацы, дык зараз даўніна. Наконт палітыкі я не хачу браць слова. Па маёй думцы, суверэнны народ павінен рашаць свае праблемы ў сваім крузе, абы толькі палітыкі прытрымліваліся канстытуцыйнага закону і не парушалі чалавечых правоў.

Мяне больш цікавіць уласны панадворак — справа беларускай меншасці ў Польшчы перад набліжаючыміся самаўрадавымі выбарамі. Міхась Куптэль канстатуе, што Беларускі самаўрадавы форум сяголета, спасылаючыся на сказанае яго лідэрам Міхасём Андрасюком, заваюе большасць. Каб толькі. Міхась Андрасюк стаў журналістам радыё „Рацыя”. Ці хопіць яму часу на належную выбарчую кампанію ў набліжаючыхся самаўрадавых выбарах? Палітыкі ўсіх палітычных груповак пачалі ўжо дзейнічаць і яднаць выбаршчыкаў. Аб БСФ ні слова ў сродках масавай інфармацыі. Ці не наступіў час узяцца за гэта?

І апошняя справа. Ці крытычныя публікацыі Яўгена Мірановіча паўплывалі на адносіны ўлады да Праграмнай рады „Нівы”? На маю думку, і так, і не. Мне здаецца, што з першых гадоў перастройкі беларуская меншасць у Польшчы была „соллю ў воку” для палітыкаў праваіцы. Прыкладаў не трэба далёка шукаць — устанаўленне закону аб нацыянальных і этнічных меншасцях. І што перамянілася? Усё застаецца запісам на паперы. Тое, што адкрылі радыё „Рацыя” ды візіт прэм'ера Казімежа Марцінкевіча напярэдадні Каляд, гэта палітычны трук, калі палітыкі намагаюцца выкарыстаць беларускую меншасць перад набліжаючыміся выбарамі. І гэта для іх удаецца, паколькі няма адзінства ў нашым народзе. А крытыкаваць уладу на старонках „Нівы” мы павінны. Гарантуе нам гэта Канстытуцыя і абавязак, якім зараз карыстаюцца шматлікія журналісты СМІ.

Уладзімір Сідарук

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Накład: 1 700 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2006 r. upływa 5 czerwca 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2006 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Мікалай Панфілюк

Белая Русь

Дзе знаходзіцца Белая Русь,
Таямнічая, прыгожая Беларусь,
І яе беластоцкі ўчастак,
Дзе нават лепшы і моўны парадак?
Гэта мы ўсе беларусы: я, ты і ён.
Пройдзе яшчэ многа дзён,
Таксама і гадоў
Каб мы зразумелі і дараслі да пладоў.
Гэта не простая рэч,
На гэта патрэбен духоўны меч:
Выкараніць ім пустазелле, крапіву,
Падрыхтаваць глебу пад жніва,
Пасеяць зярно — слова на зямлю сэрца;
Яму тут расці і галоўнае месца.
Каб вырасла на славу народа,
Вялікага беларускага рода.
Бярэмся за работу!
Прэч нікчэмнасць, страх і мода;
Гэта першыя сімптомы нашай слабасці.
Дай Бог жыць нам у радасці
І быць свядомым, што калі беларус —
Мовы сваёй і каранёў не адракусь;
Апынуўшыся нават на краю света.
Белая Русь — мая мэта!
Малюсь за незалежную Беларусь —
Яе таксама ніколі не адракусь;
Адна кроў, фальклор, абычаі...
Хаця там многія людзі жывуць у адчаі,
Ды прыйдзе дзень спакою, стабілізацыі.
Не мінаваць шматлікіх і правакацый
Са стараны цёмных сіл і падобных,
Чужых, крывых, пустых і няродных.
І барані Божа — мовы не цурацца
І ў сіле веры, надзеі і любові мацавацца.
Як у нас — у Беластоцкім Краю,
Так і там, за мяжою, ім пашану аддаю.

У. Данілюк

На Князевай гары

Даўно я быў у краіне роднай,
Не бачыў вёсак, свойскіх хат,
Не бачыў лавак пад платамі
Адкуль плыў спеў нашых дзяўчат.

І вось у мінулым годзе ўвосень
Прыйшлося мне крыху там пабыць,
Пабачыць родную старонку,
Дарожкай польнай пахадзіць.

Пайшоў на Князеву я горку,
Потым пакрочыў уніз, убок,
Дзе недалёка ад дарожкі
У чыстым полі рос дубок.

Дубок даўно пілою зрэзан.
Аб гэтым я калісь пісаў.
Зямлю, з якой дубочак вырас,
Плугамі трактар заараў.

На ўсход, на полі, за мяжою,
Дзе вецер рваў калісь пясок,
Цяпер пакрыў тыя загоны
Сасновы гусценькі лясок.

У тым ляску растуць дубочкі,
Галінкі туляць да сасны.
Іх бацька сам рос у чыстым полі,
Інакш растуць яго сыны.

Птушкам вялікая падзяка
За тое што ў даўнія гады
Насілі ў лес і заграбалі
Насенне дуба — жалуды.

З жалудоў выраслі дубочкі,
Растуць між соснамі ў цішы,
А да мяне быццам шапталі:
„Наш род не згінуў", — напішы.

Беларускае Аб'яднаньне Студэнтаў і Беларускі Саюз у Польшчы запрашаюць на Сьвяткаваньне Акту 25 Сакавіка, якое адбудзецца ў суботу 25 сакавіка ў Ваяводзкім Асяродку Анімацыі Культуры ў Беластоку („Spodki", ul. Św. Rocha 14) у 12 гадзін.

Жыве Беларусь!

„Даўціпы" Андрэя Гаўрылюка

Сустрэліся тры жанчыны. Першая кажа:

— Мой муж так ганяецца за спаднічкамі, што як сузіраю дзяцей на вуліцы, дык задумоўваюся, ці яны не ягоныя.

— А мой так рэдка начуе дома, — кажа другая, — што я задумоўваюся, ці ён з'яўляецца бацькам маіх дзяцей.

— А мой, — кажа трэцяя, — столькі разоў мяне ашукваў, што я няўпэўнена, ці з'яўляюся мацерай маіх дзяцей.

* * *

У дзіцячай краме:

— Мама, — просіць дачуся, — купі мне гэтую вялікую спячую ляльку!

— Гэта не лялька, донечка, гэта прадаўшчыца.

* * *

Гутараць дзве сяброўкі:

— У мяне такі парадак, што калі сваруся з мужам, дык высылаю дзяцей на панадворак пагуляць, каб не глядзелі на нашу авантуру.

— Цяпер я разумею, чаму вашы дзеці бесперапынна на панадворку.

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — прыказку.

1. у старажытнагрэчаскай міфалогіі шматгаловая змяя, якую перамог Геркулес = 4 _ 25 _ 16 _ 11 _ 5 _;
2. не ноч = 1 _ 2 _ 3 _ 12 _ 37 _;
3. старадаўняя колючая зброя ў выглядзе доўгага дрэўка з вострым металічным наканечнікам = 33 _ 34 _ 35 _ 9 _ 10 _;
4. снежань, студзень і люты = 17 _ 18 _ 23 _ 22 _;
5. дзелу вянец = 27 _ 28 _ 24 _ 13 _ 19 _;
6. арамат = 7 _ 8 _ 14 _;
7. доўгае паглыбленне выкапанае ў зямлі = 31 _ 32 _ 26 _;
8. квадрат дзесяці = 6 _ 21 _ 15 _;
9. заслонены ад сонца спадарожнік у сонечны дзень = 36 _ 30 _ 29 _ 20 _; **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 7 нумара

Амой, апач, вуж, жывец, нуль, цана, цела, цёзка, чара.

Рашэнне: **Пацалунак можа зруйнаваць чалавечае жыццё.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Яну Міхалюку** з Чыжоў і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

26.03 – 01.04

Баран (21.03. — 19.04.) Венера ў трыгоне да Марса разбудзіць твае жарсці ды пажадлівасць. Будзеш вельмі прыцягальны для іншага полу. Пазбягай рызыканцкіх рашэнняў і не паддавай іншых спробе на цярпімасць.

Бык (20.04. — 20.05.) Шмат энергіі і запалу. Многа трапных і хуткіх рашэнняў. Да 28.03. — ашуканствы і інтрыгі, не давярай малавядомым людзям.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Шмат апасак, ляку. У такой сітуацыі цяжка рэалізаваць свае планы, але не будзе так кепска! Азірніся ў мінулае, каб выправіць памылкі і задумацца над далейшым напрамкам жыцця. Манатонія і руціна могуць знішчыць найлепшыя сувязі.

Рак (22.06. — 22.07.) Добра дагаворышся з любімай асобай і сябрамі. Добры час падпісваць гандлёвыя дамовы. У Ракаў з 27.06. — 4.07. шмат жыццёвых спраў выкрышталізуецца і ўрэшце будуць рабіць тое, на што маюць ахвоту.

Леў (23.07. — 22.08.) Цудоўныя хвіліны з блізкай асобай. Сумленна павыпаўняеш усе абавязкі. Дагаворышся з людзьмі, калі нават не будзеце пагаджацца. Адрознасць поглядаў — справа неблагая, а кожная дыскусія вучыць новаму.

Дзева (23.08. — 22.09.) Адкрыліся перад табой новыя магчымасці. Маеш добрае сэрца, а гэта прыцягвае да цябе розных неўдалот і звычайных паразітаў; не дай улазіць ім сабе на галаву. Не крытыкуй новапазнаных асоб. Смела падпісвай дамовы, старайся за новую працу, прасі ў шэфа дабаўкі.

Шалі (23.09. — 22.10.) Непаўторныя рандэву, гарачыя пачуцці. Ахвота таксама пасмакаваць жыццё і даць сабе волю ў ежы і піцці. Калі плануеш шлюб, то ў час маладзіка Месяца з цалкавітым зацьменнем Сонца могуць паявіцца нечаканыя перашкоды выкліканыя сям'ёй.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Больш дбай аб здароўе, асабліва аб кровазварот і пазваночнік. Шмат працы; варта да яе прыкласціся, бо шэф не пашкадуе ўзнагароды. У выпадку, калі ў калектыве паявіцца новая асоба, 29.03. паразуменне з ёю можа аказацца быць немагчымым. Неспадзяваныя выдаткі, непрыемныя размовы аб хатнім бюджэце.

Стралец (22.11. — 21.12.) Самотных Стральцоў чакае новае каханне, але лепш у яго не ангажавацца і паўстрымацца з дэкларацыямі. Старая пара закахаецца ў сябе нанова. У выпадку крызісу шукай адказу ў святых пісаннях, сентэнцыях філосафаў і добрай літаратуры.

Казярог (22.12. — 19.01.) Важныя справы вырашай у першыя дні тыдня. Знакаміты час на інвестыцыі. 26-29.03. можаш добра выбраць пенсійны ці страхавы фонд.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Час спакою і стабілізацыі ў пастаяннай пары, горш у кампанейскіх сувязях. Шанц зарабіць грошы, але з-за павольнасці можаш гэтага не выкарыстаць.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Шмат баявітасці, энергіі. Шанц пазнаёміцца з кімсьці цікавым. Прадбачлівасць і прадпрымальнасць. У апошнія дні сакавіка можаш сустрэць сваю палавінку. Шчырасць і спантаннасць.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960